ШЛЯХ
АД СЭРЦА
ДА СЭРЦА

6

АСТРАВЕЦ –
ГОРАД
МАЛАДЫХ

Выдаецца
з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

3 КРАСАВІКА 2024 г.
СЕРАДА
№ 66 (30200)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

КАРОТКА

- **Экспертны савет падтрымаў праект дакумента аб Беларускім добраахвотным пажарным таварыстве.**
- У Гродне адкрыўся Расійскі цэнтр навукі і культуры.
- **Чытачы Нацыянальнай бібліятэкі атрымаюць доступ да рэсурсаў Прэзідэнцкай бібліятэкі імя Б. М. Ельцына.**
- Пасольства Балгарыі ў Беларусі пачне прыём дакументаў на шэнгенскія візы на два тыдні пазней, чым запланавана. Раней балгарскае пасольства анансавала пачатак выдачы шэнгенскіх віз з 1 красавіка.
- **У Беларусі аўтаперавозчыкам дазволілі разлічвацца наяўнай валютай з нерэзідэнтамі.**
- Мінпрамы Беларусі і Расіі зацвердзілі 25 пашпартоў інвестпраектаў за сродкі расійскага дзяржкрэдыту.

ЦЫТАТА ДНЯ

Наталля ТАРАСЕНКА, дэпутат Палаты прадстаўнікоў:

«З увядзеннем Закона «Аб адказным абыходжанні з жывёламі» ў дзяржаве з'явіцца прававая база, якая будзе рэгуляваць усе адносіны ў сферы абыходжання з жывёламі. Лічу, што гэты закон важны для выхавання нашага грамадства ў духу гуманнасці, маральнасці, менавіта ў адносінах да тых жывых істот, якія ад нас залежаць. Бо яны таксама адчуваюць, таксама перажываюць эмоцыі, адчуваюць боль. Гэты закон накіраваны на гуманізацыю ў цэлым нашага грамадства».

ISSN 1990 — 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«КЛОПАТ АБ ДЗЕЦЯХ, УНУКАХ, УСІХ, ХТО ПРАЦЯГНЕ НАШ РОД, — СУТНАСЦЬ СЁННЯШНЯГА МОМАНТУ»

Якія перспектывы адкрывае камандзіроўка Прэзідэнта ў Гродна

З памяццю аб мінулым, клопаце аб сучасным і з надзеяй на будучыню прайшла рабочая паездка Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ў Гродна. Праграма гэтай камандзіроўкі атрымалася насычанай і разнапланавай, але з адным пасылам — клопату аб дабрабыце жыхароў горада і рэгіёна.

СТАР. 2–3

Фота БелТА.

Другі шанц

Чаму варта ўстанавіць аўтаномныя пажарныя апавяшчальнікі?

Аўтаномныя пажарныя апавяшчальнікі паступова становяцца дэвайсам, запатрабаваным у жылым фондзе. Устанавіць гэтыя ўстройствы, якія дазваляюць своечасова выявіць узгаранне і не праспаць уласнае жыццё, імкнуцца жыхары і прыватных домаўладанняў, і гарадскіх кватэр. Людзі ведаюць: спраўляцца з надзвычайнай сітуацыяй лепш на раннім этапе, чым потым ліквідоўваць яе наступствы. А яны могуць быць самыя сумныя.

СТАР. 4

Актуальна

ТОЛЬКІ НАЙЛЕПШЫЯ З НАЙЛЕПШЫХ

Якой прадукцыі будзе прысвойвацца Дзяржаўны знак якасці

Указ «Аб Дзяржаўным знаку якасці» быў падпісаны 18 студзеня 2024 года. З мэтай развіцця гэтага дакумента 29 сакавіка 2024 года падпісана пастанова ўрада аб парадку прысваення знака якасці. Пра тое, якая прадукцыя зможа яго атрымаць і што для гэтага павінен зрабіць вытворца, распавялі прадстаўнікі Дзяржстандарта.

ПЯЦЬ КРЫТЭРЫЯЎ

— Знак якасці прысвойваецца харчовым таварам, прамысловым таварам для насельніцтва, прадукцыі вытворча-тэхнічнага прызначэння, выкананай юрыдычнымі асобамі Рэспублікі Беларусь, у адпаведнасці з крытэрыямі, указанымі пры апісанні знака якасці. Гэта бяспека, экалагічнасць, інавацыйнасць, тэхналагічнасць і эстэтычнасць, — падкрэсліла **першы намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі Рэспублікі Беларусь Алена МАРГУНОВА**.

Візуальная форма — пяцівугольнік, дзе кожны з бакоў сімвалізуе адзін з гэтых крытэрыяў, дадала яна.

СТАР. 5

«КЛОПАТ АБ ДЗЕЦЯХ, УНУКАХ, УСІХ, СУТНАСЦЬ СЁННЯШНЯГА

Фота БелТА.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Пытанне, з якога Прэзідэнт пачаў рабочую паездку ў Гродна: «Ну, сабраў камяні?» Яно адрасавана памочніку Прэзідэнта — інспектару па Гродзенскай вобласці Юрыю Караеву. Гэта пытанне Аляксандр Лукашэнка падымаў тыдзень таму падчас камандзіроўкі ў Ашмянскі раён. Тады кіраўнік дзяржавы абураўся ўбачанымі на палях камянямі і даручыў кіраўніцтву вобласці вырашыць гэту праблему. «Вельмі шмат. Працэнтаў 60 сабралі», — далажыў Юрый Караеў. Кіраўніка дзяржавы запэўнілі, што работы вядуцца, мабілізаваны неабходныя сілы, у тым ліку з навучальных устаноў, прамысловых прадпрыемстваў. Камяні на палях — гэта сапраўды праблема. Падчас збору ўраджаю яны могуць сур'ёзна сапсаваць тэхніку, якая каштуе нятанна. І гэта не толькі фінансавыя страты, але і некалькі дзён прастою. «У камбайн трапіць — камбайна няма. Паўмільёна долараў», — адзначыў Прэзідэнт. У цэлым, у Гродзенскай вобласці актыўна ідзе пасяўная кампанія. Дзякуючы спрыяльным умовам надвор'я ў сакавіку гэтага года сельскагаспадарчыя арганізацыі раней пачалі вясновыя сельскагаспадарчыя работы, яравы пасеў плануецца правесці на плошчы 327,5 тысячы гектараў. Для правядзення работ вобласць забяспечана сельскагаспадарчай тэхнікай, насеннем і ўгнаеннямі, палівам.

МЫ РОБІМ УСЁ, КАБ ЗАХАВАЦЬ МІР НА ЗЯМЛІ

Падчас гэтай камандзіроўкі Прэзідэнт у прамым сэнсе слова зрабіў задзел на будучыню. Кіраўнік дзяржавы заклаў капсулу на месцы будаўніцтва гарадской клінічнай бальніцы па праспекце Янкі Купалы. У пасланні, якое змешчана ў капсуле, сказана, што мы, стваральнікі суверэннай Беларусі, жывём у вельмі цікавы і няпросты час. На дварэ красавік 2024-га. Ярка свеціць сонца, прачынаецца прырода, на палі выйшлі хлебаробы, кожны на сваім месцы займаецца любімай справай, побач гучаць дзіцячыя галасы. «Але наша сэрца баліць. І мы пішам вам, таму што свет вакол мяняецца. Мы жывём у эпоху нябачанага ў параўнанні з мінулымі стагоддзямі навукова-тэхнічнага прагрэсу, але мільярды трацяцца на ўзбраенні і рэгіянальныя канфлікты. Планета палае. Цэлыя народы страчваюць свой дом і спрабуюць знайсці прытулак за тысячы кіламетраў ад сваёй Радзімы. Мы дапамагаем усім, хто просіць аб дапамозе, і робім усё, каб захаваць крохкі мір на гэтай Богам падоранай зямлі. І верым, што захаваем. Таму будуем дзіцячыя сады і школы, паліклінікі, бальніцы і новыя вытворчасці, культурныя, спартыўныя і гандлёва-забаўляльныя цэнтры», — сказана ў пасланні. Паколькі капсула закладваецца сёлета, калі адзначаецца 80-годдзе вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, у пасланні выказана спадзяванне, што патомкі працягваюць тысячагадовую гісторыю беларускага народа вялікімі справамі. «Верым, што рана ці позна ўся энергія чалавецтва, розум і інтэлект будуць накіраваны выключна на стварэнне, што вы ступіце далей і выйдзеце за межы Сонечнай сістэмы! Калі зрабілі гэта — як зрэнку вока, беражыце нашу Зямлю, калыску чалавецтва. Наш агульны дом, які заўсёды чакае вас».

ТРЭБА ЗРАБІЦЬ МЕДЫЦЫНУ НАРОДНАЙ

Але перш чым будаваць планы на будучыню, Прэзідэнт пацікавіўся, як ідуць справы сёння. Як гэта часта бывае падчас рабочых паездак у рэгіёны, абмеркаванне найважнейшых пытанняў праходзіла на нагах. У міністра аховы здароўя Аляксандра Хаджаева кіраўнік дзяржавы пацікавіўся, як той асвойваецца на пасадзе, якія ёсць цяжкасці і праблемы. «Трэба зрабіць медыцыну, як у нас раней казалі, народнай. Усім даступна, аднолькава», — паставіў Прэзідэнт галоўную задачу перад міністрам. Аляксандр Хаджаеў запэўніў, што даручэнні кіраўніка дзяржавы выконваюцца, у тым ліку па цэнаўтварэнні і кадрах. Кіраўнік дзяржавы пацікавіўся, ці рабочы ў Міністэрстве аховы здароўя калектыў, ці трэба вырашаць кадравыя пытанні. Міністр далажыў, што ў гэтым кірунку ў найбліжэйшы час будуць прапанаваны кандыдатуры. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ў сістэме аховы здароўя трэба трымаць цвёрды курс. Па яго словах, рэперных кропак там шмат, кланаў звышдастаткова, «любяць «паплаваць» так, як зручна, начальнікаў абслужыць». Таму, па словах Прэзідэнта, трэба парадак наводзіць.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу ў цэлым на кадравае пытанне ў медыцыне. «Кажуць, таго не хапае, гэтага не хапае. Урачоў, медсясцёр... Слухай, у нас усяго хапае. Толькі ў нас некаторыя катэгорыі, у тым ліку ўрачы, хочуць працаваць, як у нас, а жыць, як на Захадзе, і атрымліваць вялікія грошы», — сказаў ён. Але, па словах кіраўніка дзяржавы, на Захадзе зарабляюць тыя, хто суткамі працуе. Пры гэтым і ў Беларусі медыкі ў найлепшых клініках зарабляюць прыстойныя грошы. Акрамя таго, ён нагадаў, што дзяржава аказала істотную падтрымку медыкам падчас пандэміі каранавіруса і нават пасля пандэміі гэтыя надбаўкі захаваліся. «Але далей трошкі і самім трэба варушыцца. Выдатная прафесія, цудоўная спецыяльнасць. Лепшай, напэўна, у свеце няма. Вядома, і адказнасць, і паварушыцца трэба. Пераразмяркуйцеся і працуйце як след», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік Гродзеншчыны Уладзімір Каранік, які раней быў міністрам аховы здароўя, звярнуў увагу, што ў свой час Прэзідэнт прыняў рашэнне аб матэрыяльнай падтрымцы ўрачоў у яшчэ большым памеры, чым прасіла Міністэрства аховы здароўя.

БАЛЬНІЦА ПАВІННА БЫЦЬ ПАБУДАВАНА ЗА ДВА ГАДЫ

Старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Каранік далажыў Прэзідэнту аб сацыяльна-эканамічным развіцці рэгіёна. Па яго словах, у рэгіёне выкананы ўсе сацыяльныя абавязацельствы, рост намінальнай заработнай платы за 2023 год склаў 18 працэнтаў, за студзень — люты гэтага года перасягнуў 19 працэнтаў, а рост валавога рэгіянальнага прадукту дасягнуў амаль 8 працэнтаў. «Далейшае развіццё рэгіёна немагчыма без інвестыцый, таму ў Гродзенскай вобласці рэалізоўваецца 114 праектаў», — сказаў старшыня Гродзенскага аблвыканкама. У рамках даручэння Прэзідэнта «Адзін раён — адзін праект» зацверджаны 21 праект, яны знаходзяцца ў розных стадыях рэалізацыі. Працягваецца рэалізацыя сацыяльных праектаў.

Акцэнт Уладзімір Каранік зрабіў на ўстановах аховы здароўя. Ужо адкрылі першую чаргу анкалагічнага дыспансера, будаўніцтва і абсталяванне якога працягваецца. А пачатак узвядзення новай бальніцы кажа сам за сябе. Рашэнне аб будаўніцтве аб'екта прынята ў сувязі з аптымізацыяй ложкавага фонду гарадскіх клінічных бальніц № 2 і № 3. Цяпер аддзяленні бальніцы № 2 размешчаны ў будынках канца XIX стагоддзя, дзе для пацыентаў цяжка стварыць належныя ўмовы, якія б адпавядалі патрабаванням сучаснай якаснай медыцыны. Новы аб'ект, які разлічаны больш чым на 500 ложкаў, будзе дзейнічаць разам з размешчанай побач гарадской бальніцай № 4. Гэта дазволіць рацыянальна выкарыстаць ложкавы фонд устаноў аховы здароўя горада. Уладзімір Каранік растлумачыў, што праект бальніцы распрацаваны з улікам пандэміі. Пры неабходнасці аб'ект можна заніраваць, «аддзяліць» адно з чатырох «крылаў», лячыць там, напрыклад, толькі інфекцыйныя захворванні. Таксама магчымасці новай бальніцы будуць дазваляць праводзіць раннюю дыягностыку захворванняў, эфектыўна выкарыстоўваючы «залатую гадзіну», своечасова аказваць медыцынскую дапамогу пацыентам. Тут будуць сканцэнтраваны ў асноўным аддзяленні тэрапеўтычнага профілю з кабінетамі эндаваскулярнай хірургіі, а таксама дыягнастычныя аддзяленні. Пры гэтым, як запэўніў губернатар, бальніца спраектавана без лішніх выдаткаў. На яе будаўніцтва закладзены тэрмін 51 месяц. Але, як заўважыў Прэзідэнт, гэта зашмат. «Гэта доўга, давайце спросцім і пабудуем за два гады», — даручыў Прэзідэнт. Жалезнае патрабаванне — падысці па-гаспадарску і зрабіць так, каб у людзей не было скаргаў.

Прэзідэнт таксама падкрэсліў, што будаўніцтва гэтай бальніцы і ў цэлым дзейнасць сістэмы аховы здароўя ў вобласці павінна быць пад кантролем Міністэрства аховы здароўя. Аляксандр Хаджаеў запэўніў, што ведамства працуе ў звязцы з Гродзенскім аблвыканкамам, а ён асабіста абмяркоўвае з Уладзімірам Каранікам самыя важныя моманты.

ГРОДНА — НАШ ГОРАД. НІ МІЛІМЕТРА НІКОМУ НЕ АДДАДЗІМ

На цырымоніі закладвання капсулы прысутнічалі гараджане: моладзь, ветэраны, прадстаўнікі арганізацый і прадпрыемстваў. «Калі нехта думае, што Гродна — гэта чужы горад і не зусім беларускі — забудзьце. Гродна — наша краіна, наша зямля, наш горад. Ні міліметра мы нікому тут нічога не аддадзім. А калі камусьці дрэнна, цяжка тут, дык мы ж нікога не трымаем. Шкада, канешне, што некаторыя з'язджаюць, але мы нікога не трымаем», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён звярнуў увагу, што многія з тых, хто з'язджае, лячыцца ўсё роўна прыязджаюць у Беларусь, бо тут гэта танна. Але, па словах Прэзідэнта, пытанне будзе ўрэгулявана, бо бясплатная і танная медыцына ў Беларусі — гэта падаткі беларусаў.

Размаўляючы з гродзенцамі, кіраўнік дзяржавы зноў вярнуўся да кадравага пытання ў медыцыне. «Хачу дактарам сказаць публічна: мы перажылі пандэмію, якая вырасла ў каронапсіхоз. Мы прайшлі яе годна. Адзіныя ў свеце мы пайшлі гэтым шляхам. Дрэнна-добра — але сёння выснова адна: калі б мы не пайшлі гэтым шляхам, нас бы ўжо не існавала. Мы не раскідвалі грошы з верталёта, таму што іх не было рэальных, а надрукуеш — заўтра нікому беларускія рублі нашы не патрэбныя (гэта ж не долары, яны там друкуюць, па ўсім свеце разыходзяцца, інфляцыя ўсё з'ядае), — нагадаў Аляксандр Лукашэнка. — Мы пайшлі своеасаблівым шляхам. Мы цяпер бачым, што не памыліліся, што правільна пайшлі». Прэзідэнт нагадаў таксама, што многія беларусы такія дзеянні не падтрымалі. Але тады такія, магчыма, непапулярныя, дзеянні былі неабходныя. Тады ж было вырашана дапамагчы ўрачам. Прэзідэнт і тагачасны міністр аховы здароўя Уладзімір Каранік асабіста наведвалі бальніцы, паказваючы, што ўлада не ўбаку. Было прынята рашэнне па матэрыяльнай падтрымцы дактароў. Тыя надбаўкі захаваліся і пасля пандэміі. Таму, паводле слоў беларускага лідара, дзяржава зрабіла дастаткова для ўрачоў. Той, хто хоча зарабляць шмат, — шмат працуе і атрымлівае годны заробак. А тым, хто хоча працаваць, як у Беларусі, а зарабляць, як на Захадзе, Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што там палова зарплаты ідзе на падаткі, медыцына і адукацыя платныя. «Вы хочаце гэтага? Не пытанне. Калі вы хочаце гэтага, мы з Каранікам за паўгода перавядзём вас на польскую сістэму, еўрапейскую. Але тады ўсе за сябе, — іранічна прапанаваў Прэзідэнт. — Мы не можам прыняць такія прынцыпы і такую палітыку. У нас сацыяльна арыентаваная дзяржава. Я ведаю, што такое просты чалавек. А гэта палова нашых людзей. Яны не змогуць жыць». Рэзюмуючы, Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што ўрачоў і медсясцёр дастаткова, але трэба ім плаціць. Ён запэўніў, што, калі ў медыцыне, адукацыі і іншых сферах будуць лішнія грошы, яны пойдуць выключна на патрэбы гэтай сферы.

«І не забывайце, што зарплата зарплатай, але калі не будзе храмаў, дзе мы лечым людзей, дзе ўстаноўлена дарагое абсталяванне, калі не будзе абсталявання, мы людзей лячыць не зможам. Зарплата — гэта капейкі ў параўнанні з тым, што мы будзем укладваць вось сюды (у бальніцы. — **«Зв.»**) і асабліва ў абсталяванне», — выказаўся кіраўнік дзяржавы.

НЕ БУДЗЕМ УКАЛВАЦЬ — ЗАГІНЕМ

Выступаючы перад гараджанамі, Прэзідэнт падкрэсліў, што тут не проста ўзводзіцца новы будынак — тут пачынаецца дыялог з новымі пакаленнямі беларусаў. З тымі, хто прыйдзе пасля нас. «І ў цэлым усё, што створана, пабудавана і мадэрнізавана нашымі рукамі за гады незалежнасці, — гэта пасланне ў будучыню. І гэта будоўля — пасланне ў будучыню. Хто яго ведае, змогуць нашы дзеці так, як мы. Ніхто не ведае. Асабліва ў гэты бурны час, — сказаў Прэзідэнт. — Мы хочам, каб беларусы жылі, стваралі сем'і, вучыліся, працавалі, адпачывалі ў прыгожых, утульных і камфортных гарадах і вёсках. Робіцца ўсё, каб у кожнага была магчымасць перш за ўсё атрымаць годную адукацыю». Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што ніколі не было такіх умоў для паступлення ва ўніверсітэты, як сёння. Магчымасць атрымаць вышэйшую адукацыю ёсць ва ўсіх. Той, хто нармальна вучыцца ў школе, можа паступіць амаль ва ўсе ВНУ. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што для сферы адукацыі створаны ўсе ўмовы, і людзі на іх ужо не асабліва скардзяцца. Таму з нашых універсітэтаў выходзяць цудоўныя спецыялісты. У адваротным выпадку, па словах кіраўніка дзяржавы, іх бы не цягнулі ў іншыя краіны. «Мы робім усё, каб у вас была магчымасць. А калі ёсць магчымасць, далей трэба рухацца самім», — канстатаваў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што часам беларусы ствараюць не дзякуючы, а насуперак жыццёвым абставінам. Ён растлумачыў, чаму забараніў ураду і чыноўнікам скардзіцца на санкцыі: «Я зыходзіў з простай логікі. Калі начальніку, чыноўніку, дырэктару прадпрыемства даць магчымасць адкруціцца ад таго, каб напружвацца і працаваць, — ён гэтым скарыстаецца. Таму я адразу сказаў: «Санкцый няма, забудзьце, для вас санкцый няма». Якая розніца нашым людзям:

ХТО ПРАЦЯГНЕ НАШ РОД, — МОМАНТУ»

ёсць санкцыі, няма санкцый — яны хочуць жыць, яны хочуць працаваць. А час выбраў начальнікамі нас. І мы павінны зрабіць усё, каб нашы людзі жылі, працавалі і маглі ўтрымліваць сям'ю, сваіх дзетак. І дзеткам трэба варушыцца, трэба сваіх дзяцей прывучаць да працы». Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што ў Беларусі аказваецца ўсялякая падтрымка шматдзетным сем'ям. Напрыклад, тым сем'ям, у якіх выхоўваецца пяцёра і больш дзяцей, дапамагаюць пабудаваць дом, выдзяляюць зямельныя ўчасткі. Але, як паказвае досвед, часта такія дамы і ўчасткі не даглядаюцца. Узнікае пытанне: навошта тады дзяржава траціла сродкі і будавала гэтыя дамы, калі да іх так нядбайна ставяцца?

«Давайце глядзець праўдзе ў вочы, я да вас не падлашчвацца прыехаў. Не будзем укалваць — загінем. Іншага няма шляху. Пакуль яшчэ не прыдумалі, чым замяніць працу. Як хочаце мяне разумейце. Галоўнае — магчымасць. Дзяржава павінна даць магчымасць», — заявіў Прэзідэнт. Магчымасць сёння ёсць, таму трэба ёй карыстацца і працаваць, і не толькі для сябе, але і для будучых пакаленняў. «Клопат аб дзецях, унуках, усіх, хто працягне наш род, усіх, хто прыйдзе пасля нас, — сутнасць сённяшняга моманту і сутнасць ідэі сённяшняга мерапрыемства», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён падкрэсліў, што праз нейкія 50-100 гадоў, улічваючы развіццё інфармацыйных тэхналогій, пра сучасных беларусаў будуць ведаць усё і нават больш. «Але ці будзе гэта веданне ісцінай? Ці ўбачаць беларусы будучыні ў масіве інфармацыі нашы сапраўдныя намеры? Таму мы і пакідаем тут пасланне. У ім нашы шчырыя надзеі, і ўсе яны прадыктаваны імкненнем да міру і стваральнай працы», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

МЫ КАПАЕМ ЗЯМЛЮ ПОБАЧ З ГРАНІЦАЙ. АЛЕ МЭТЫ Ў НАС РОЗНЫЯ

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што закладванне капсулы на месцы будаўніцтва бальніцы — гэта яшчэ і своеасаблівае пасланне нашым суседзям: «Пакуль ішоў сюды, да будаўнічай пляцоўкі, злавіў сябе на думцы: мы ж цяпер таксама капаем зямлю, як і яны, зусім побач з граніцай. Толькі мэты ў нас розныя. Там капаюць акопы, траншэі... Павялічваюць выдаткі на ўдарныя ўзбраенні. А мы тут дзве трэці бюджэту рэгіёна накіроўваем на сацыяльную сферу. Мы хочам пабудаваць мірную будучыню. Мы настроены толькі на стваральную працу», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт заклікаў не верыць заявам аб тым, што Беларусь хоча ваяваць. Але прызнаў, што мы рыхтуемся ваяваць, але гэта ўжо не навіна, бо гучыць часта. Логіка простая: хочаш міру — рыхтуйся да вайны. Па словах Аляксандра Лукашэнкі, гэта вельмі правільная думка. «Калі адтуль нехта падвывае і нас крытыкуе — ведайце, мы робім правільна. Калі нас пачнуць хваліць — бяда. Мы нікому не пагражаем, нам не трэба некаму пагражаць. Мы не хочам чужой зямлі, нам гэтую дай бог апрацаваць», — сказаў Прэзідэнт. Ён яшчэ раз звярнуў увагу, што да ўсяго трэба ставіцца адказна і думаць на перспектыву. І зноў знаёмы прыклад. Прыбраныя з палёў камяні дазволяць захаваць сельскагаспадарчую тэхніку і не траціць грошы на яе рамонт. Аляксандр Лукашэнка зрабіў акцэнт, што сёння трэба быць ашчаднымі як ніколі. Гэта ашчаднасць і выратавала беларусаў. Прэзідэнт падкрэсліў, што сёння ў краіне вялікія планы і яны будуць рэалізаваныя, бо трэба зрабіць задзел для будучых пакаленняў. Гэта галоўнае. «Мы павінны зрабіць так, каб нашы дзеці, абапіраючыся на тое, што зрабілі мы, зрабілі больш, — сказаў ён. — Трэба сёння зрабіць максімум. Бо мы не ведаем, будуць нашы дзеці такімі ж, змогуць яны працаваць так, як мы. Пакуль я гэтага не бачу. Як бы моладзь ні захвальвалі, пакуль я гэтага не бачу».

ТРЭБА ШАНАВАЦЬ СВАЁ

Аляксандр Лукашэнка прызнаўся, што хацеў прыехаць на старт гэтай будоўлі, пабываць на захадзе Беларусі. «І яшчэ раз ад першай асобы сказаць вам, што вы нашы, што мы вас нікому не аддадзім», — сказаў ён. Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што сваю палітычную кар'еру ён пачынаў на Гродзеншчыне. І тады мясцовыя жыхары аказалі давер маладому палітыку. Што да суседзяў па граніцы, з якімі ў гродзенцаў, ды і ва ўсіх беларусаў, заўсёды былі сяброўскія адносіны і якія сёння адгарадзіліся плотам, то, па словах Прэзідэнта, гэта іх справа. Ён звярнуў увагу, што тыя, хто прымае такія рашэнні за мяжой, кіруюцца не інтарэсамі сваіх грамадзян, а маюць свае карыслівыя мэты, нажываючыся на будаўніцтве агароджаў. Беларусь на гэтым фоне, наадварот, адкрытая для наведванняў, увяла бязвізавы рэжым, на што заходнія суседзі сталі палохаць сваіх грамадзян верагоднасцю вярбоўкі ў Беларусі. «Гасподзь з вамі, не трэба мне гэта вярбоўка. Хто ж так вярбуе? Каго трэба, мы ўжо даўно завербавалі», — заўважыў Прэзідэнт.

«Мы гэта перажывём. Мы хочам мірнага жыцця. Я не хачу, каб нашы людзі ваявалі. Гэта з асабістага. А з дзяржаўнага таксама, я паўтараю пастаянна: нам чужога не трэба. Чужы кавалак ірве раток. Так у народзе гаварылі, я гэта засвоіў са свайго вясковага жыцця. Я не хачу нічога чужога. І заўсёды кажу: не чапай чужое — бокам вылезе. І вам хачу завяшчаць: чужога не чапайце. Рана ці позна гэта ператворыцца ў катастрофу, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Я хачу, каб вы, вашы дзеці і ўнукі жылі ў спакойнай мірнай краіне. Пакуль я Прэзідэнт, пакуль мае памочнікі працуюць тут і па ўсёй краіне, мы будзем праводзіць гэту палітыку».

Аляксандр Лукашэнка не проста выступіў перад гараджанамі, але і асабіста пагаварыў з людзьмі. «Гродзенцы — проста малайцы, — сказаў ён. — Хацелася б, каб вашы людзі тут жылі, працавалі, лячылі, ад гэтага нікуды не падзенешся». Кіраўнік дзяржавы заклікаў трымацца разам і не сварыцца, як бы ні было цяжка: «У нас зямлі дастаткова. А калі ёсць свая зямля — тады і жыць будзем нармальна». Па яго словах, можна ездзіць за мяжу, глядзець, як там што, але трымацца трэба за сваё, не губляць карані. Аляксандр Лукашэнка расказаў, што тыя, хто з'ехаў у 2020 годзе, сёння хочуць вярнуцца, звяртаюцца ў адпаведную камісію пад старшынствам генпракурора Андрэя Шведа. «Трэба шанаваць сваю зямлю. Сваё трэба шанаваць, каб потым не прасіцца назад. Вядома, людзей шкада. Яны тады ў сацыяльных сетках усё паказвалі сябе. А сёння мы бяром гэтыя сеткі і глядзім, хто чым займаўся. Хто там у першых шэрагах ішоў і гатовы быў забіваць з нажамі, сякерамі. А хтосьці ачмурэў проста ад пандэміі і іншае. Людзі павінны мець права на памылку. Таму і створана гэтая камісія, і працягнулі яе паўнамоцтвы», — сказаў ён. Беларускі лідар падкрэсліў, што тых, хто ўсё зразумеў і ўсвядоміў, трэба вяртаць да жыцця. Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што беларусы заўжды былі адкрытыя і шчыра настроеныя да іншых народаў. «Простыя палякі і літоўцы да нас добра ставяцца. Разумеюць нас. І мы павінны пабеларуску так. У нас жа сумесь: палякі, яўрэі, беларусы, рускія, украінцы. Гэта самы якасны народ. І мы павінны быць такімі, гнуткімі, акуратнымі», — сказаў кіраўнік дзяржавы. «Вы не хвалюйцеся. Будзе так, як я кажу. У мяне падвойнага дна ў палітыцы няма. Будзе так, як будзе выгадна нашым людзям ад Гродна да Оршы», — запэўніў Прэзідэнт.

КРЫТЭРЫЙ АДЗІН — ЭФЕКТЫЎНАСЦЬ І ТАК, ЯК ЛЕПШ ДЛЯ КРАІНЫ

Прэзідэнт таксама наведаў новую шкляную вытворчасць ААТ «Гродзенскі шклозавод», у прыватнасці яго вытворчую пляцоўку «Аульс». Ва ўсім свеце няма выпадкаў, калі б за пяць гадоў у чыстым полі была пабудавана такая вытворчасць. Беларускі аб'ект пабудаваны за два гады — рэкордныя тэрміны. Беларускае прадпрыемства стваралася падчас пандэміі, ва ўмовах санкцыйнага ціску. Але айчынныя спецыялісты ўсё вытрымалі і прайшлі вялікую навуку.

Прэзідэнту далажылі аб рэалізацыі інвестыцыйнага праекта «Стварэнне вытворчасці шкляной тары з выкарыстаннем інавацыйных, энергаэфектыўных і рэсурсазберагальных тэхналогій». Па выніках рэалізацыі гэтага праекта арганізавана вытворчасць шклатары на трох лініях шклаварнай печы прадукцыйнасцю 220 тон у суткі, створана 104 рабочыя месцы, на якіх занятыя 279 чалавек.

Аляксандр Лукашэнка азнаёміўся з сучаснымі тэхналогіямі распрацоўкі і выпуску вырабаў са шкла. Генеральны дырэктар кіруючай кампаніі холдынга «Беларуская шкляная кампанія» Юрый Скрыпко расказаў, што прадпрыемства можа выпускаць да 200 мільёнаў штук вырабаў тары, 60 мільёнаў тон у год. Вытворчасць арганізавана па апошнім слове тэхнікі і тэхналогій.

Прэзідэнту паказалі сыравіну для вытворчасці шкла, прыродныя матэрыялы, якімі не надта багатая наша краіна, і тое, што ляжыць літаральна пад нагамі, — шклабой. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што трэба максімальна выкарыстоўваць тое, што ёсць, каб не купляць тое, чаго няма, бо ашчаднасць сёння вельмі важная. Юрый Скрыпко падкрэсліў, што працаваць са шклабоем больш зручна і выгадна, чым з прыроднымі матэрыяламі. Калі апрацоўваецца шклабой, таксама ўтвараюцца адходы, адсеў, дробная фракцыя шкла, якую ў шкловарэнні ўжываць нельга. І гэтыя адходы або адпраўляцца на звалку, або атрымліваюць новае жыццё — іх успеньваюць. Па словах Юрыя Скрыпко, успененае шкло — гэта ўцяпляльны матэрыял, які валодае выключнымі характарыстыкамі, не гарыць, не тоне, даволі трывалы. «У нас ёсць сыравіна. І мы з гэтага можам зрабіць добры тавар», — заўважыў Прэзідэнт, таму ён даручыў ураду ўзяць гэтае пытанне на кантроль.

Галоўны пасыл Прэзідэнта падчас наведвання шклозавода — дзейнічаць у дзяржаўных інтарэсах і так, каб быў эфект. Таксама Аляксандр Лукашэнка сказаў, што ведае ўсё, што робіцца на месцах. Таму ніякай хлусні быць не павінна, гэта датычыцца і членаў урада, і мясцовых улад, і кіраўнікоў прадпрыемстваў. «Ваш падман прывядзе да таго, што будуць прыняты няправільныя рашэнні. Хлусні быць не павінна! Крытэрый адзін — эфектыўнасць і так, як лепш для краіны», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы прайшоўся па цэхах завода, сучасных і зручных. Напрыклад, у сыравінным цэху прадугледжаны ўсе ўмовы, каб выключыць староннія негатыўныя ўздзеянні, якія могуць паўплываць на канчатковую якасць тавараў. Цэхі на прадпрыемстве максімальна аўтаматызаваныя. Увесь вытворчы працэс арганізаваны так, каб мінімізаваць шкоднае ўздзеянне на навакольнае асяроддзе. «Асаблівасцю гэтага завода можна адзначыць так званую ўтылізацыю цяпла. Гэта значыць, завод выкарыстоўвае цяпло газаў самой печы, якія адыходзяць пры варэнні, пераўтварае гэтую энергію і мы самастойна сябе забяспечваем гарачым водазабеспячэннем і ацяпленнем», — распавёў генеральны дырэктар Гродзенскага шклозавода Дзяніс Юрчанка. Што датычыцца непасрэдна прадукцыі, то на заводзе можна вырабіць бутэлькі і слоікі самых розных памераў, што вельмі актуальна для многіх беларускіх прадпрыемстваў. Гэта і прадэманстравалі Прэзідэнту на невялікай выстаўцы прадукцыі завода.

Нараўне з бягучай дзейнасцю на прадпрыемстве на пастаяннай аснове ажыццяўляецца інвестыцыйная. У прыватнасці, у 2023—2024 гадах на дзеючай пляцоўцы ААТ «Гродзенскі шклозавод» запланавана рэалізацыя інвестыцыйнага праекта «Тэхнічная мадэрнізацыя тэхналагічнай лініі шклаварнай печы № 7 цэха пракатнага шкла і шклатары ААТ «Гродзенскі шклозавод» па адрасе: г. Гродна, вул. Суворава, 40» агульным коштам 93 млн рублёў. Праект прадугледжвае абнаўленне маральна і фізічна зношанага абсталявання па вытворчасці шклатары.

Падводзячы вынікі наведвання шклозавода, Прэзідэнт падкрэсліў, што, калі будзе ідэя, карысная і абгрунтаваная, яна будзе рэалізоўвацца. «Толькі хаваць, красці не трэба. І ўсё будзе нармальна», — падсумаваў Аляксандр Лукашэнка. Кіраўнік дзяржавы таксама пакінуў свой запіс у кнізе ганаровых гасцей Гродзенскага шклозавода. Запіс пад нумарам адзін. «Вы не павінны нікога баяцца, калі вы добра працуеце. Калі чалавек нечага баіцца — чакай бяды», — на развітанне параіў Прэзідэнт.

Валерыя СЦЯЦКО,
Гродна.

У тэму

ТАРНАЯ ГАЛІНА Ў КРАІНЕ ПАВЯЛІЧВАЕ МАГУТНАСЦІ

У размове з журналістамі генеральны дырэктар Гродзенскага шклозавода Дзяніс Юрчанка падкрэсліў, што галоўная асаблівасць гэтага прадпрыемства — тое, што адзіны выпадак за пяць гадоў у свеце, калі ў чыстым полі з нуля быў пабудаваны шклатарны завод.

«Тэхналогіі, электрападагрэў, абсталяванне, размешчанае на дадзенай пляцоўцы, — гэта самае лепшае, што было апошнім часам. Мы гэта змаглі атрымаць, мы гэта змаглі прывезці, мы гэта змаглі ўстанавіць, і гэта запрацавала. Тое, аб чым марыла ўся каманда Гродзенскага шклозавода, тое, што падтрымаў Прэзідэнт, мы ўвасобілі ў жыццё», — сказаў ён.

Дзяніс Юрчанка адзначыў, што сёння няма праблем з рэалізацыяй іх прадукцыі: «Першапачаткова завод будаваўся, каб задаволіць патрэбы ў шклатары піўных холдынгаў. Мы павінны былі ў нейкай меры замяшчаць іх патрэбы. Але яны палічылі, што ім яшчэ рана звяртацца да шклатары. І так атрымліваецца, што завод запушчаны і тыя аб'ёмы, якія ён гатовы вырабляць, вырабляе на існуючы рынак, нягледзячы на піўныя холдынгі. І калі ім чарговы раз спатрэбіцца шкло, а гэта палітыка дзяржавы і Прэзідэнта — адысці ад пластыку да шкла, атрымаецца, што ім спатрэбіцца яшчэ дватры такія прадпрыемствы. А на тым, што мы на першапачатковым этапе будавалі для іх, мы змаглі замясціць усе аб'ёмы на той жа ўнутраны рынак або экспартныя пазіцыі».

Генеральны дырэктар Гродзенскага шклозавода нагадаў, што некалі стаяла пытанне аб існаванні тарнай галіны ў краіне, а само прадпрыемства было практычна банкрутам. Тады, дзякуючы Прэзідэнту, ураду, банкірам, якія паверылі ў гэтае прадпрыемства, яго ўдалося захаваць. «Тарная галіна ў Рэспубліцы Беларусь не тое што развіваецца — яна працягвае павялічваць магутнасці, памнажае сваю вытворчасць у разы. І мы прыйшлі да таго, што ў 2023 годзе запусцілі абсалютна новую вытворчасць, чым сёння ганарымся», — падкрэсліў Дзяніс Юрчанка.

Другі шанц

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Пажараў, якія забіраюць чалавечыя жыцці, у Міністэрстве па надзвычайных сітуацыях рэгіструюць нямала. Няспраўнасці пячнога ацяплення, раптоўны выхад са строю электрычных прыбораў або электраправодкі, курэнне дома, дзіцячае свавольства з агнём — усё гэта прывядзіць да гібелі людзей, калі крыніца ўзгарання своечасова не выяўлена. Унікальнае ўстройства — аўтаномны пажарны апавяшчальнік — інфармуе аб тым, што побач бяда, а значыць, дае чалавеку другі шанц на жыццё. І такіх прыкладаў нямала.

Гісторыі са шчаслівым канцом

Невядома, чым мог бы скончыцца пажар у адным са шматпавярховікаў Барысава два гады таму, калі б не спрацаваў аўтаномны пажарны апавяшчальнік. Дзякуючы гэтаму ўстройству выратаваліся дзесяць жыхароў, сярод якіх — шасцёра дзяцей. Калі на другім паверсе трохпавярховага жылога дома пачалося ўзгаранне, усе яго жыхары спалі. Моцнае задымленне прывяло да спрацоўкі аўтаномнага пажарнага апавяшчальніка. Ад гуку прыбора прачнуліся гаспадар адной з кватэр і яго дзіця. Убачыўшы задымленне на другім паверсе, яны пабудзілі жыхароў астатніх кватэр. Да прыбыцця ратавальнікаў усе самастойна выйшлі з дома на вуліцу.

Днямі аўтаномны пажарны апавяшчальнік выратаваў жыццё пенсіянеркі ў Шчучыне. Было каля гадзіны ночы, калі ўсхваляваны гараджанін паведаміў ратавальнікам аб тым, што пачуў гук аўтаномнага пажарнага апавяшчальніка. Ён выйшаў на лесвічную пляцоўку і выявіў, што гарыць суседская кватэра, дзе па яго меркаванні, магла знаходзіцца пажылая гаспадыня. Чатыры пажарныя каманды неадкладна накіраваліся да месца выкліку. Праз дзве хвіліны першае аддзяленне МНС прыбыло па ўказаным адрасе і выратавала гаспадыню кватэры, дзе пачаўся пажар. Як пазней расказала жанчына, яна ўключыла прас і забылася пра яго. Уначы пенсіянерка адчула пах гары, адчыніла дзверы ў кватэру, каб вывятрыць, а сама вярнулася ўнутр — шукаць крыніцу дыму.

Тым часам 32-гадовы сусед, пачуўшы, што апавяшчальнік спрацаваў, паведаміў пра здарэнне ў МНС, увайшоў у задымленую кватэру праз адчыненыя дзверы. У адным з пакояў ён выявіў дэзарыентаваную ў прасторы 91-гадовую гаспадыню і тлеючую драўляную падлогу пад уключаным у электрасетку прасам. Мужчына вывеў пенсіянерку на чыстае паветра, затым вярнуўся ў кватэру, адключыў прас і заліў узгаранне вядром вады. Да гэтага моманту прыбылі супрацоўнікі МНС. Ратавальнікі праветрылі кватэру пенсіянеркі і ўпэўніліся ў немагчымасці аднаўлення гарэння. Медыцынская дапамога пацярпелай не спатрэбілася.

Дзякуючы своечасовай спрацоўцы аўтаномных пажарных апавяшчальнікаў, летась у Гродзенскай вобласці былі выратаваны восем чалавек, пяцёра з якіх — дзеці. І ўжо сёлета гэты прыбор працягвае ратаваць жыцці. Не выключэннем з'яўляюцца іншыя рэгіёны краіны. У вёсцы Уза Гомельскай вобласці на пажары выратаваліся маці і двое дзяцей. Як высветлілася, у момант пажару ў хаце знаходзіліся 38-гадовая гаспадыня і двое яе дзяцей — 10-гадовая дачка і аднагадовы сын. Жанчына пачула гук спрацаванага пажарнага апавяшчальніка ў гаражы, прыбудаваным да хаты. Выйшаўшы на вуліцу, яна ўбачыла, што дах дома гарыць, і пабегла ўнутр, каб вывесці дзяцей. 41-гадовы муж жанчыны ў гэты час быў на рабоце. Калі пажарныя прыбылі на месца здарэння, дах дома быў ахоплены полымем. У выніку пажару ён быў знішчаны, як і аўтамабіль, які знаходзіўся ў гаражы. Таксама быў пашкоджаны дах цагляной адрыны. На шчасце, людзі засталіся жывымі — і ўсё дзякуючы невялічкаму ўстройству, якое жыхары дома ўстанавілі не толькі ў кожным жылым пакоі дома, а і ў гаражы. Як у воду глядзелі.

Найлепшы падарунак

Такіх гісторый са шчаслівым канцом становіцца ўсё больш. Аднак, на жаль, на пажарах працягваюць гінуць людзі, у тым ліку дзеці. Ратавальнікі рэгулярна наведваюць домаўладанні, абследуюць жылы сектар на прадмет наяўнасці аўтаномных пажарных апавяшчальнікаў і рэкамендуюць устанавіць іх тым, у каго пакуль што няма.

— Аўтаномны пажарны апавяшчальнік адчувальны нават да нязначнага задымлення ў памяшканні, што спрыяе хуткаму выяўленню ўзгарання на ранняй стадыі яго развіцця, — адзначае **афіцыйны прадстаўнік Мінска-га абласнога ўпраўлення МНС Анастасія ШВАЙБОВІЧ.** — Пры з'яўленні дыму ён падае магутны гукавы сігнал, які здольны апавясціць і нават абудзіць чалавека, які спіць. Завецца прыбор аўтаномным, паколькі яго канструкцыя выканана такім чынам, што для работы яму не патрабуецца падключэнне да электрычнага ланцуга і далучэнне да пульта кіравання. Усярэдзіне пластыкавага корпуса размешчана крыніца харчавання — батарэйка тыпу «Крона» і кампаненты, неабходныя для выяўлення пажару і непасрэднага абвяшчэння аб ім.

Установка апавяшчальніка не патрабуе спецыяльных ведаў і навыкаў. З гэтым можа справіцца кожны дарослы чалавек. У камплекце да яго прыкладаецца падрабязная інструкцыя, якая ўтрымлівае ўсю неабходную інфармацыю аб мантажы, прыладзе і правілах эксплуатацыі. Прыбор зусім не псуе інтэр'ера, яго крапежная пляцоўка замацоўваецца на столі пры дапамозе шруб, а ўжо ў яе ўстанаўліваецца сам аўтаномны пажарны апавяшчальнік — паварочваннем па гадзіннікавай стрэлцы да ўпора. Для змантажу дастаткова павярнуць прыладу супраць гадзіннікавай стрэлкі.

Па словах Анастасіі Швайбовіч, аўтаномны пажарны апавяшчальнік рэкамендуецца ўстанаўліваць у цэнтральнай частцы столі з невялікім зрушэннем у бок акна або дзвярэй — там, дзе забяспечаны пастаянны паветрааб-мен. «Размешчаны на корпусе апавяшчальніка сігнал святлодыёда чырвонага колеру, які мігціць, сведчыць аб яго спраўнасці і знаходжанні ў дзяжурным рэжыме працы. Пры выяўленні задымлення прыбор падае перарывісты гукавы сігнал з пастаянным свячэннем святлодыёда чырвонага колеру. Для спынення падачы гукавога сігналу апавяшчальніка трэба ліквідаваць крыніцу задымлення і праветрыць памяшканне».

Ратавальнікі рэкамендуюць не радзей чым раз на месяц чысціць пажарны апавяшчальнік ад пылу і правяраць яго працаздольнасць шляхам націску на тэставую кнопку. Супрацоўнікі МНС як ніхто ведаюць: аўтаномны пажарны апавяшчальнік стане добрым падарункам у кожнай сям'і. Наяўнасць у доме ці кватэры гэтага невялікага ўстройства павышае магчымасць раней даведацца аб пажары, прыняць адпаведныя меры і пазбегнуць трагічных наступстваў.

Вераніка КАНЮТА.
Фота прэс-службы Міністэрства па надзвычайных сітуацыях.

Приорбанк RBI Group

«ПРИОРБАНК»
Открытое акционерное общество, 220002, г. Минск, ул. В. Хоружей, 31А, информирует своих акционеров, что 29 марта 2024 года состоялось годовое Общее Собрание акционеров банка в очной форме

На годовом Общем Собрании акционеров банка были рассмотрены все вопросы повестки дня:

1. Об отчете Наблюдательного Совета банка за 2023 год.
2. Об отчете Правления о работе банка за 2023 год.
3. О рассмотрении заключения Ревизионной комиссии по результатам проведения ревизии за 2023 год. Об утверждении годовых отчетов, годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности за 2023 год; распределении прибыли за 2023 год с учетом заключения Ревизионной комиссии и аудиторского заключения.
4. Об установлении размера дивидендов и срока их выплаты.
5. Об избрании членов Ревизионной комиссии «Приорбанк» ОАО.
6. Об избрании членов Наблюдательного Совета «Приорбанк» ОАО.

По всем вопросам приняты положительные решения.

Выплата дивидендов по привилегированным акциям, установленных в размере 35 копеек на одну акцию, начнется не позднее 04 апреля 2024 года.

Лицензия на осуществление банковской деятельности НБ РБ № 12 от 13.02.2024 года. УНП 100220190.

ОПЕРАТИВНАЯ ИНФОРМАЦИЯ
«О формировании реестра владельцев ценных бумаг»

Полное наименование и местонахождение акционерного общества	**ОАО «Элегант» 222161, Минская область, г. Жодино, пр-т Ленина, 22**
Наименование уполномоченного органа акционерного общества и дата принятия им решения, в соответствии с которым осуществляется формирование реестра акционеров	**Наблюдательный совет ОАО «Элегант» Протокол заседания № 2 от 27.03.2024 года**
Дата, на которую осуществляется формирование реестра акционеров	**28.03.2024 года**

УНН 600039318

17 апреля 2024 г. **№ 3-Н/2024**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ
по продаже не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с продажей права аренды земельного участка в г. Гомеле

№ лота	Наименование объекта/ адрес земельного участка: г. Гомель	Целевое назначение/ срок аренды	Кадастровый номер, площадь земельного участка	Начальная стоимость, руб.	Сумма задатка, руб.	Расходы на подготовку документации, руб.	Наличие ограничений, обременений
1	Не завершенный строительством жилой дом в районе индивидуальной жилой застройки Романовичи, У-1784 (по генплану) ул. Каскадная, 14	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома/ аренда сроком по 4 сентября 2122 года	340100000008004072, 0,0789 га	49 574,53	9 419,16	6 588,99	Зона санитарной охраны источников питьевого водоснабжения централизованных систем питьевого водоснабжения, охранная зона линий, сооружений электросвязи и радиофикации, зона санитарной охраны водопроводных сооружений, охранная зона объектов газораспределительной системы, обременения в связи с размещением на земельном участке не завершенного строительством здания одноквартирного жилого дома, частично капитального ограждения смежного землепользователя по ул. Каскадной, 16

1. Организатор аукциона – коммунальное топографо-геодезическое унитарное предприятие «Гомельгеодезцентр».

2. **Аукцион проводится комиссией, созданной Государственным предприятием «Гомельгеодезцентр», в соответствии с Положением о порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов на земельном участке в г. Гомель, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 г. № 220.**

3. **Аукцион состоится 17 апреля 2024 г. в 14.30 в Гомельском городском исполнительном комитете по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 16,** при наличии не менее двух участников. Если заявление на участие подано только одним гражданином Республики Беларусь, право аренды земельного участка предоставляется этому лицу при его согласии с внесением платы за право аренды в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на **5 процентов.**

4. К участию в аукционе допускаются граждане Республики Беларусь, индивидуальные предприниматели и юридические лица. В аукционе допускается участие на стороне покупателя консолидированных участников, подавших в Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр» в указанные в извещении сроки, следующие документы: заявление по установленной форме; документ, подтверждающий внесение суммы задатка в размере, указанном в извещении с отметкой банка, на **р/с BY74 BAPB 3012 2030 8001 3000 0000 в ЦБУ № 301 ОАО «Белагропромбанк» г. Гомель, ул. Интернациональная, 30, УНП 400230163, БИК BAPBBY2X. Получатель платежа – Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр». Наименование платежа – оплата задатка за участие в аукционе.**

Кроме того НЕОБХОДИМО открыть текущий расчетный счет (с указанием транзитного счета) в ЦБУ № 301 ОАО «Белагропромбанк» г. Гомель, ул. Интернациональная, 30 – для возврата задатка за участие в аукционе (в случае непобеды на аукционных торгах).

Перечень документов, предоставляемых участником:

4.1. заявление на участие в аукционе; документ, подтверждающий внесение суммы задатка; **гражданам Республики Беларусь** – копия паспорта, **представителем гражданина** – нотариально удостоверенная доверенность.

4.2. представители или уполномоченные должностные лица Республики Беларусь – доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов.

5. Лицо, желающее принять участие в аукционе, обязано подписать с организатором торгов Соглашение, определяющее взаимные права, обязанности и ответственность сторон, в процессе подготовки и проведения аукциона.

6. **Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на предоставление предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан:**

6.1. В течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся, в размере, определенном соответствующим протоколом аукционных торгов:

- часть оплаты за предмет аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения в установленном порядке за земельный участок), за вычетом суммы, причитающейся за не завершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом;
- часть платы за предмет аукциона – цена продажи не завершенного строительством незаконсервированного одноквартирного жилого дома, исчисленную пропорционально его удельному весу в начальной цене предмета аукциона, за вычетом расходов, понесенных на оплату оценки;
- возместить расходы, понесенные городским бюджетом по изготовлению земельно-кадастровой документации и государственной регистрации земельного участка;
- компенсировать организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения (окончательный размер которых определяется до аукциона и фиксируется в соответствующих ведомостях ознакомления участников).

6.2. После совершения победителем аукциона действий, предусмотренных в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка, и представления организатору аукциона и в местный исполнительный комитет копий платежных документов, но не позднее двух рабочих дней, с ним в установленном порядке в соответствии с условиями аукциона местный исполнительный комитет заключает договор аренды земельного участка.

7. **Заявления для участия в аукционных торгах принимаются Государственным предприятием «Гомельгеодезцентр» с 5 по 15 апреля 2024 г. включительно. Дни приема: *понедельник, среда, пятница* с 08.00 до 16.30 (обед 12.00–13.00) по адресу: г. Гомель, ул. Барыкина, 149, 3-й этаж, каб. 3-6, 3-14.**

Контактный телефон +375 232 30-12-46.

Информация размещена на сайте: www.geodezcentr.by, gomeloblzem.by, gki.gov.by, газета «Звязда», «Гомельские ведомости»

РОЗНЫЯ, АЛЕ — РОЎНЫЯ

Фота БелТА.

У рамках работы кансультатыўнага савета па пытаннях сацыяльнай адаптацыі і інтэграцыі дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця ўчора, да Сусветнага дня распаўсюджвання інфармацыі аб праблеме аўтызму, у Савеце Рэспублікі была арганізавана выстаўка работ навучэнцаў, якія маюць расстройствы аўтыстычнага спектра.

Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава, якая прысутнічала на адкрыцці выстаўкі, адзначыла: «Я ўвесь час дзіўлюся таленту нашых хлопчыкаў і дзяўчынак. Нават тыя, якія сёння ў сілу сваіх асаблівасцяў маюць нейкія адхіленні ў развіцці, на самай справе таленавітыя, творчыя, кожны ў сваім кірунку. І вельмі важна, што сапраўды ў нашай краіне сёння можна рэалізаваць усе свае жаданні і патрэбы, якія ёсць у кожнага чалавека. Але тым, каму трэба, мы павінны аказваць дапамогу і садзейнічанне, каб кожны чалавек знайшоў сябе, раскрыў свае таленты, рэалізаваў свае жаданні».

Наталля Качанава нагадала, што напярэдадні адбылося ўрачыстае мерапрыемства з нагоды ўручэння дыпломаў выпускнікам Мінскага дзяржаўнага каледжа лічбавых тэхналогій з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. «Учора мы ўручылі дыпломы аб адукацыі тым, хто вучыцца ў Мінскім каледжы лічбавых тэхналогій. З радасцю, размаўляючы з дырэктарам, мы гаварылі аб тым, што яны сёлета набіраюць дзяўчат і хлопцаў, у якіх ёсць аўтыстычныя расстройствы. І ў нас ёсць дастаткова шмат устаноў, якія навучаюць тых, у каго ёсць нейкія асаблівасці ў развіцці, — падкрэсліла Старшыня Савета Рэспублікі. — Учора ўзнікла такая ідэя — на базе Мінскага каледжа лічбавых тэхналогій стварыць асацыяцыю каледжаў, якія працуюць з такімі навучэнцамі, і ў далейшым адсочваць іх лёс. Ужо падключыліся прадпрыемствы, арганізацыі, якія працаўладкоўваюць гэтых маладых людзей. Важна, што выпускнікі гэтага каледжа (праўда, там не аўтыстычныя расстройствы, а некаторыя праблемы са слыхам, зрокам) ужо ўсе працаўладкаваныя, будуць працаваць на нашым высокатэхналагічным прадпрыемстве «Інтэграл». Прафесія, якую яны атрымалі, вельмі запатрабавана на рынку працы, гэта адзін з перспектыўных кірункаў развіцця нашай эканомікі. Таму цудоўна, што мы сёння яшчэ раз бачым, якія поспехі ёсць у нашых хлопцаў, у нашых маладых людзей».

Спікер упэўнена: такія выстаўкі павінны праходзіць. «Яны ўжо арганізоўваюцца пад эгідай Беларускага саюза жанчын. І ў далейшым мы будзем арганізоўваць не проста выстаўкі, а выстаўкі-продажы», — дапоўніла Наталля Качанава.

Паводле БелТА.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Урад Дэмакратычнай Рэспублікі Конга ўпершыню ўзначаліла жанчына

Жудыт Сумінва Тулука прызначана прэм'ер-міністрам Дэмакратычнай Рэспублікі Конга, паведамілі еўрапейскія СМІ. «Я ведаю, што задача вялікая, выклікі вялізныя, але разам мы справімся», — заявіла новы кіраўнік урада па нацыянальным тэлебачанні краіны неўзабаве пасля абвяшчэння аб яе прызначэнні на гэтую пасаду прэзідэнтам ДРК Феліксам Чысекедзі. Былы міністр планавання Тулука змяніла Жан-Мішэля Сама Лукондэ, які займаў пасаду прэм'ер-міністра з лютага 2021 года і падаў у адстаўку сёлета 21 лютага. Яна стала першай жанчынай-прэм'ерам у гісторыі ДРК.

Колькасць немаўлят у Італіі абнавіла гістарычны мінімум

Колькасць дзяцей, народжаных у Італіі, у мінулым годзе знізілася на 3,6 працэнта і абнавіла гістарычны мінімум, паводле даных нацыянальнага статыстычнага агенцтва Istat. Летась колькасць немаўлят скарацілася да 379 тысяч у параўнанні з 393 тысячамі годам раней. Паказчык 2022-га быў самы нізкі з моманту ўтварэння адзінай італьянскай дзяржавы ў 1861 годзе. Пры гэтым 13,3 працэнта дзяцей летась з'явілася на свет ад замежных грамадзян, якія жывуць у Італіі. Дзесяцігоддзем раней гэтая доля складала 15 працэнтаў. Сумарны каэфіцыент нараджальнасці (сярэдняя колькасць дзяцей на адну жанчыну) у краіне ў мінулым годзе знізіўся да 1,2 з 1,24 годам раней і амаль паўтарыў гістарычны мінімум, які быў зафіксаваны ў 1995-м і складаў 1,19.

Венгерскія навукоўцы даказалі, што сабакі разумеюць значэнне слоў

Мозг сабак, як паказалі вынікі эксперымента, які правялі венгерскія навукоўцы, па-рознаму рэагаваў на правільныя і няправільныя абазначэнні цацак, паведаміў Euronews. У даследаванні выкарыстоўваліся неінвазіўныя электроды. «Мы лічылі, што калі сабака насамрэч разумее значэнне слова, якое абазначае прадмет, то ён будзе чакаць убачыць менавіта гэты прадмет. А калі гаспадар пакажа іншы прадмет, у мозгу сабакі ўзнікне так званая рэакцыя здзіўлення. І гэта менавіта тое, што мы вызначылі», — адзначыла Мар'яна Бораш з універсітэта Этваша Лоранда. Сабакі, паводле меркавання вучоных, ад нараджэння надзелены здольнасцю да рэферэнцыйнага разумення — фарміравання разумовых уяўленняў аб аб'ектах, якія абазначаюць словамі. Верагодна, гэтая здольнасць дапамагла ўсталяваць унікальную сувязь паміж жывёлай і чалавекам.

ТОЛЬКІ НАЙЛЕПШЫЯ З НАЙЛЕПШЫХ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Знак якасці не прысвойваецца тытунёвым вырабам, нетытунёвым нікаціназмяшчальным вырабам, вадкасцям для электронных сістэм курэння, расказала спікер. Не могуць атрымаць знак якасці ўзбраенне і ваенная тэхніка, а таксама харчовыя прадукты, створаныя з выкарыстаннем генна-мадыфікаваных мікраарганізмаў. Акрамя таго, знак не прысвойваецца прадукцыі, да якасці якой прад'яўляліся прэтэнзіі кантрольна-наглядным органамі на працягу года, які папярэднічае падачы заяўкі на атрыманне Дзяржаўнага знака якасці, падкрэсліла Алена Маргунова.

ЯК ПАДАЦЬ ДАКУМЕНТЫ?

Перш за ўсё, вытворца павінен самастойна вызначыць, якая яго прадукцыя можа прэтэндаваць на прысваенне знака якасці, адзначыла прадстаўнік Дзяржстандарта.

— Звяртаю ўвагу, што гэта не асартыментны шэраг, а толькі адзін від прадукцыі, якая выпускаецца на дадзеным прадпрыемстве. І гэта прадукцыя павінна вырабляцца серыйна, — сказала Алена Маргунова.

За кошт уласных сродкаў вытворца праводзіць параўнальны аналіз паказчыкаў якасці абранай ім прадукцыі па ўсіх пяці «гранях» знака з найлепшымі айчыннымі і замежнымі аналагамі.

— Па ступені навізны, тэхналагічных аспектах, па тых момантах, дзе тэхналогія была ўдасканалена і гэтак далей, — патлумачыла першы намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі. — На гэтыя паказчыкі вытворца атрымлівае пратаколы выпрабаванняў, абавязкова — у акрэдытаванай лабараторыі.

Наступны крок — запаўненне заяўкі (яе ўзор ёсць у пастанове Савета Міністраў). Запоўненая заяўка з пералікам доказных матэрыялаў (пратаколаў іспытаў) падаецца ў выканаўчы камітэт па месцы знаходжання прадпрыемства.

— Рэгістрацыйны орган выканкама калегіяльна — падкрэсліваю — ажыццяўляе праверку паўнаты прадстаўленых вытворцам дакументаў, і калі ўсё выканана ў адпаведнасці з патрабаваннямі, накіроўвае дакументы ў сакратарыят Дзяржстандарта, які забяспечвае арганізацыйна-тэхнічнае суправаджэнне гэтых дакументаў у Рэспубліканскую атэстацыйную камісію, — працягнула спікер. — Альбо сакратарыят, ацаніўшы прадстаўленыя дакументы, можа адмовіць у далейшым іх прасоўванні.

Гэта можа адбыцца, напрыклад, калі доказных звестак не хапае або яны прадстаўлены не ў поўным аб'ёме.

ХТО І ЯК ПРЫСУДЖАЕ?

— Рэспубліканская камісія ствараецца на базе Савета Міністраў, у яе ўваходзяць віцэ-прэм'еры, прэм'ер-міністр і прадстаўнікі адпаведных дзяржаўных органаў, у чыім веданні знаходзіцца дзейнасць дадзенага прадпрыемства, — паведаміла Алена Маргунова. — Камісія праводзіць поўную ацэнку прадукцыі па ўсіх паказчыках, неабходных для прысваення знака якасці.

Адначасова звесткі аб прадукцыі, якая прэтэндуе на атрыманне знака, размяшчаюцца ў сетцы Інтэрнэт для яе анлайн-ацэнкі спажыўцамі, і сакратарыят Дзяржстандарта інфармуе грамадскасць аб магчымасці анлайн-галасавання па заяўленых відах прадукцыі на вызначэнне такога яе паказчыка, як эстэтычнасць. Крытэрый «эстэтычнасць» для харчовых прадуктаў — гэта іх арганалептычныя паказчыкі, для іншых відаў прадукцыі — візуалізаваныя: упакоўка, знешні выгляд, ацэнка формы і дызайну, расказала Алена Маргунова. Гэты крытэрый ацэньваецца толькі праз анлайн-галасаванне. Кожны, хто жадае, можа выказаць сваё меркаванне і паўдзельнічаць у прасоўванні прадукцыі, што прэтэндуе на атрыманне знака якасці.

Астатнія чатыры «грані» якасці ацэньваюць адказныя органы.

— Што датычыцца бяспекі прадукцыі, ацэнку праводзіць непасрэдна Дзяржстандарт на падставе тых патрабаванняў, якія прапісаны ў нарматыўна-прававой дакументацыі на гэты від прадукцыі. Гэта можа быць харчовая бяспека, электрабяспека, радыяцыйная бяспека і гэтак далей. Мінпрыроды ацэньвае такі крытэрый, як экалагічнасць. Тут разглядаецца менавіта экалагічны складнік дадзенай вытворчасці. Інавацыйнасць, трэці крытэрый, ацэньвае Дзяржаўны камітэт па навуцы і тэхналогіях: на падставе распрацаванай метадалогіі выяўляе ступень паляпшэння гэтай прадукцыі, укараненне інавацый, удасканаленне момантаў тэхналогій (альбо гэта новая тэхналогія, або яна ўдасканалена і на які працэнт), прымяненне новых тэхналагічных рашэнняў. Паказчык «тэхналагічнасць» ацэньваюць рэспубліканскія органы дзяржаўнага кіравання або іншыя арганізацыі, падпарадкаваныя Савету Міністраў, у чыім веданні знаходзіцца дзейнасць гэтага вытворцы (той дзяржорган, які выступае рэгулятарам па гэтым напрамку). Тут разглядаецца працаёмкасць, матэрыялаёмістасць, энергаёмістасць, прагрэсіўнасць тэхналогіі — усё, што датычыцца тэхналагічных аспектаў у залежнасці ад віду прадукцыі, — растлумачыла Алена Маргунова.

Калі прадукцыя, якая прэтэндуе на прысваенне Дзяржаўнага знака якасці, не будзе адпавядаць хаця б аднаму з крытэрыяў, Дзяржстандарт мае права накіраваць вытворцу апавяшчэнне аб адмове ў прысваенні гэтай прадукцыі знака якасці, звярнула ўвагу яна.

Рашэнне Рэспубліканскай атэстацыйнай камісіі — апошні этап. Камісія будзе ўзначальвацца прэм'ер-міністрам або намеснікамі прэм'ер-міністра. Яна, як ужо гаварылася, уключае кіраўнікоў дзяржаўных органаў, у чыім падпарадкаванні знаходзіцца дадзеная вытворчасць. У яе таксама могуць уключацца кіраўнікі іншых рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання або службовыя асобы апарату Савета Міністраў, кампетэнтныя менавіта ў родзе дзейнасці гэтага вытворцы. Вывучыўшы ўсе матэрыялы, атэстацыйная камісія прымае рашэнне большасцю галасоў — або аб прысваенні знака якасці, або аб прыняцці адмоўнага заключэння. Вынік афармляецца пратаколам, які падпісваецца старшынёй (у адсутнасці старшыні — намеснікам старшыні) камісіі. На падставе гэтага пратакола рыхтуецца пастанова Савета Міністраў, і — калі заключэнне камісіі станоўчае — прысуджаецца знак якасці.

ШТО ГЭТА ДАЕ ВЫТВОРЦУ?

Знак якасці прысуджаецца на два гады.

— Гэта дастатковы тэрмін з улікам крытэрыю «інавацыйнасць» і бурнага развіцця эканомікі, — падкрэсліла Алена Маргунова.

Знак якасці вытворца два гады мае права наносіць на маркіроўку і пакаванне менавіта той прадукцыі, якой ён быў прысуджаны, выкарыстоўваць знак ва ўсіх суправаджальных дакументах. Знак якасці павінен быць добра бачны, ён можа быць чырвонага або чорнага колеру, расказала прадстаўнік Дзяржстандарта.

Акрамя таго, у пастанове ўрада прапісаны шэраг стымуляцыйных ільгот і прэферэнцый, якія атрымлівае вытворца, чыя прадукцыя ўдастоена знака якасці.

— У першую чаргу гэтыя прэферэнцыі носяць іміджавы характар, — адзначыла **начальнік упраўлення ацэнкі адпаведнасці і ліцэнзавання Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі Рэспублікі Беларусь Вольга БАБКО**. — Яны накіраваны на тое, каб дапамагчы нашым вытворцам прасоўваць сваю прадукцыю і заяўляць аб сабе, дазволяць вылучыць яе на паліцах крам.

Так, дзяржаўныя органы павінны будуць размяшчаць інфармацыю аб прадукцыі, удастоенай знака якасці, на сваіх сайтах, а ў магазінах і павільёнах будуць выдзелены спецыяльныя месцы для гэтай прадукцыі. Таксама адзначаная прадукцыя будзе ў прыярытэце, напрыклад, падчас выставачных мерапрыемстваў за мяжой.

Упершыню ўручэнне дыпломаў аб прысваенні Дзяржаўнага знака якасці адбудзецца ўжо сёлета — чакаецца, што яно будзе прымеркавана да Сусветнага дня якасці.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.

ШЛЯХ, ЯКІ ДАЙ БОГ ПРАЙСЦІ...

Заспрачаліся сонца і вецер, хто хутчэй распране жанчыну. «Ну, вядома ж, я», — сказаў першы і падзьмуў на яе з такой страшнай сілай... Здавалася, што яшчэ крыху і сарве жаночую шапачку, разматае шалік, расшпіліць гузікі! Але ж не, не тут тое было, бо чым мацней дзьмуў вецер, тым болей хуталася жанчына, а ўрэшце і зусім — уцякла, схавалася ў хаце. «Ну вось... Табе і распранаць няма каго?» — знясілеў вятрыска. «Зараз будзе», — усміхнулася ў адказ сонца, і зазірнула ў акно той хаціны, і паклікала гаспадыню на вуліцу, і сагрэла, і... распранула — ледзь не да майкі-шортаў... Прычым сёлета — яшчэ ў сакавіку!

Гэта — на памяць, што называецца. Як і многае іншае.

Дом — гэта...

Вечар, трамвай, вольнае месца — значыць, можна сесці, пачытаць і праз нейкі прыпынак-другі неспадзеўкі, перыферычным зрокам, ля самага пляча ўбачыць... сабаку.

Ён вялікі, белы і, здаецца, усмешлівы...

Ён не супраць пакласці галаву на кніжку, а найперш — зазірнуць у вочы, папрасіць, каб пагладзілі.

Калі можна, то мы б, што называецца, з радасцю?!

Па-сабачы амаль, запытальна, падымаем вочы на гаспадара (высокага, цемнаскурага, пажылога), аднак тому яўна не да нас, бо ў яго якраз «заспяваў» мабільны, і мужчына стаў камусьці казаць (на чысцюткай рускай!), што ўсё паспеў і зрабіў, што выехаў, што зараз зойдзе ў краму па малако і прыйдзе дадому.

...Ён — дом — трэба разумець, там, дзе сям'я, а не там, дзе радзіма?

Клопат

За што купіў, як кажуць: хірург (ну вельмі стомлены!) вечарам зайшоў у кавярню, трохі перакусіў, а калі надумаў разлічыцца, да стала гаспадар падышоў, прытым з чаркай каньяку за кошт установы... І вячэра, сказаў, сёння бясплатная, бо ён, маўляў, разумее — дзень быў цяжкі, шмат аперацый. «А як вы здагадаліся?» — здзівіўся хірург. «Дык вы ж самі афіцыянту сказалі: «Усё, я скончыў. Лічыце інструменты і зашывайце».

Гэта быў анекдот. Зараз — чыстая праўда.

Дзед Юр'евіч з бальніцы прыехаў: першы раз туды трапіў і адразу «пад нож».

Казаў, што цяжка перанёс аперацыю. Ды і пасля яе доўга кволіўся — мокла рана, ніткі са шва тырчалі. «Каб жа ведаць мне, дзе клубок? — чухаў патыліцу дзед. — Добра, калі дасталі... А калі забыліся?»

Клопат.

Бусел... Ён жа бацян...

У бальніцах, што лагічна, дзеці праведваюць бацькоў. Наадварот — таксама здараецца.

Адзін дзядзька з вёскі да сына прыехаў, не без цяжкасцяў знайшоў палату, падсеў да ложка. Ну вядома ж, распытаў пра здароўе, пра дактароў, пра тое, як кормяць, нешта сам распавёў... А там — слова за слова — да размоў падключыліся іншыя. Нехта з хворых у дзядзькі спытаў (па-рускі), ну як там, на волі: ці прыйшла вясна, ці прыляцелі «аісты»?

— Не-е, ім рана яшчэ, — з веданнем справы зазначыў дзядзька. — Аісты ў дарозе пакуль. А вось буслы — буслы даўно прыляцелі.

Два ў адным?

...Вучоных-філолагаў неяк папрасілі адной фразай выказаць мір, спакой і шчасце.

Тыя, вядома ж, стараліся і варыянтаў прыдумалі шмат. А перамог як заўжды адзін: журы ледзь не геніяльным палічыла кароткае «Жонка спіць»!

На гэткае ж «званне» можа прэтэндаваць зварот, дзе ў двух (!) словах — шаноўныя старыя — сумясцілася... несумяшчальнае: і павага да людзей, і знявага.

У лес і з лесу

Вёска, рэчка (хоць невялічкая, але ёсць), лес, дзякуй богу, таксама.

Праз месяц-другі, летам, з кубачкамі-вядзерцамі мы дружненька пойдзем туды па ягады, потым — ужо з большым «пасудкам» — па грыбы. А пакуль... мяшкамі выносім смецце. Як ёсць, так ёсць. Гэта мы.

Гены

«Хлопец здуру ажаніўся...» — гэта пра Валеру. «...Навек жонкай падавіўся», — ужо, здаецца, — не, не пра яго, бо ён вельмі хутка ўбачыў, што памыліўся, што ні есці варыць, ні ў доме прыбіраць яго палавіна не будзе: прыйдзе з работы і ляжа... Устане і зноўку пойдзе.

Вось і ён пайшоў месяцаў праз пяць. Думаў, жонку пакінуў, — аказалася, што і дзіця.

...Прыязджаў, калі нарадзілася, плаціў аліменты, дасылаў падарункі-гасцінцы. Калі хлопчык пайшоў у школу, пісаў яму лісты. І малы — таксама: пра сваё жыццё, пра маці і айчыма, пра сваіх малодшых брацікаў.

Што сумна, яны, усе трое — з так званай ЗПР (затрымкай псіхічнага развіцця). Без яе ў той матулі толькі першае дзіця. «Па бацьку пайшло», — кажуць суседзі.

Хоць, здавалася б, што там ад бацькі? Не выношваў, не нараджаў, не выхоўваў. Гены...

Новая зямля

Вёска. Лавачка. Дзве бабулі. «Ты ці будзеш бульбу садзіць?» — пытае адна. Другая — хіба цяжанька ўздыхае: «Ды не з маім здароўем цяпер. З маім — хіба што ў печ».

...З нашым (каб не сурочыць!) — можна ў градкі. І не толькі бульбу.

Загадзя ў спецыяльнай краме выбіраем насенне памідораў, агуркоў, гарбузоў — грунт для расады.

Сярод іх нейкі новы — з сапрапелямі ды сарбентамі. Што радуе, нашай, айчыннай, вытворчасці. На пакеце так і напісана: «Сделано в Республике Беларусь. На Столинщине», побач — «Землица щедрая».

...Калі б «зямелька» і «шчодрая», пакупнікі — нашы дачнікі ды вяскоўцы — па логіцы вытворцаў, напэўна, не зразумелі б і не купілі?

(З Купалы:

Прыйшла зіма халодная,
Нягодная зіма, —
Цярпі, зямелька родная,
Няма жыцця, няма.)

«Помнік»

«Чорт сто лапцяў сталтаў, пакуль пару сабраў», — так казалі ў вёсцы пра Ганну з Васільком, бо яна — дзябёлая, важная... А вось ён — якраз наадварот. Да таго ж маладзейшы гадоў на пятнаццаць. Не дзіва, што паспяваў і дома ўсё парабіць, і на работу схадзіць.

...У той раз, мусіць, не адзін вярнуўся, бо як толькі дзверы адчыніў, з печы пачулася: «Васілёк, вядро ў нас пустое — вады няма... Прынясі, аднак ты адзеўшыся».

Васілёк, магчыма, галодны быў, стомлены, змерзлы, з чужым чалавекам (бо нехта ж «вынес» размову з хаты?), аднак нікуды не дзеўся — узяў вядро, пайшоў да студні.

...Яна, тая студня, дагэтуль стаіць — служыць людзям. Праўда, ужо іншым, бо ні той Ганны, ні яе Васількa (ён, дарэчы, першым памёр), даўно ўжо нямашака. Сышлі ў найлепшы свет нават іхнія дзеці, а вось гэтае «Васілёк, аднак ты адзеўшыся...» у вёсцы жыве — «помнічкам».

Валянцін Губараў. «Святло далёкай зоркі».

Жыццё — тэатр

...Дзяўчына марыла стаць артысткай, але ў тэатральным быў дужа вялікі конкурс. Паступіла туды, дзе меншы, вучылася (з горам папалам), а адначасова... іграла — мо найлепшую жаночую ролю — ролю закаханай... То ў аднаго, то ў другога, то...

Гэты, чарговы яе абраннік, быў пры пасадзе, нашмат старэйшы і даўно жанаты, што яе, на жаль, не спыніла: сама, што называецца, абрывала тэлефон, сама запрашала ў госці.

Ён ездзіў (а хто б адмовіўся?!): ездзіў рэдка і вельмі абачліва, ездзіў ненадоўга, бо любіў сваю сям'ю, жыццё і нічога ў ім мяняць не збіраўся. Пакуль...

Пакуль яму не пазванілі з бальніцы не сказалі, што каханка ў цяжкім стане.

Агаломшаны гэтай навіной, ён кінуў усё — паехаў, прарваўся праз розныя «нельга», але ўбачыў (ён яе — такую прыгожую і бездапаможную, а ўся бальніца, адпаведна, — яго), пачуў ад доктара, што жыць маладзічка будзе, а вось дзетак нараджаць — не, бо гэта цяжарнасць была пазаматачнай і ўжо другой...

Ён ва ўсім вінаваціў сябе і не мог яе кінуць.

Таму — кінуў сям'ю, ажаніўся, ссівеў, сумуючы па дзецях, памяняў работу (на ранейшай не было трафейныя, бо з нейкага штучнага шоўку, з «маланкай» замест гузікаў. У іх я атрымліваў атэстат сталасці, паступаў у інстытут і, вядома ж, рос, а вось порткі — не. Яны — як бы збягаліся — «садзіліся»: калошы сталі вельмі вузкімі і кароткімі. Да таго ж я быў добрым жыўчыкам: час ад часу барукаўся са сваімі суседзямі (у пакоі жыло 17 студэнтаў), з-за чаго штаны мае проста распаўзаліся...

Іншых не было, таму ледзь не я зашываў трафейныя, што ўрэшце заўважыў прафкам і выдаў мне талон на новыя штаны.

Да скону не забыць, як купіў і надзеў — моцныя, картовыя, з шырокімі доўгімі калошамі, як у гэтай абнове выйшаў на вуліцу, і ўвесь горад убачыў, што я самастойны, дарослы...

...З тога часу шмат вады ўцякло. Я многа падарожнічаў, бываў у розных краінах Еўропы, Азіі, Афрыкі, купляў для сябе і блізкіх самае рознае адзенне. Але ніводнае не прынесла мне столькі радасці, колькі тыя штаны».

...У Канстанціна Сіманава кароткі верш пра самы доўгі дзень 1941-га, пра вайну: *«...Она такой вдавила след / И стольких наземь положила, Что двадцать лет и тридцать лет / Живым не верится, что живы...»*

Курдская прымаўка: «У вайне галоўнае не перамагчы, а не ўдзельнічаць».

Вечнае рэха вайны

З лістоў, якія не выкінуць, не спісаць у архіў...

«У жыцці кожнага чалавека ёсць рэчы, якія помняцца да скону.

У час вайны загінулі мая маці і малодшая сястра, старэйшыя былі цяжка паранены, ад дома не засталося нічога: нават месца, дзе стаяла хаціна, было не пазнаць...

Але ж мне, жывому, хацелася жыць і вучыцца.

Ад нашай зямлянкі да школы было сем кіламетраў. З вопраткі штось перапала ад старэйшага брата, абуць не было чаго...

Да маразоў ледзь не ўсе тады хадзілі босымі, апраналіся больш чым сціпла, але ж я ўсё адно вылучаўся і найбольш у святы...

Калі вучыўся ў дзясятым класе, тата купіў мне штаны, мусіць, перспектыў на жыллё, а на новай ім далі службовае)... І ўсё ў яго ўсталявалася: ён жыве — нават добра (на першы погляд), бо жонка ж маладая, прыгожая, любіць яго...

Ці хоць-нехаць іграе ролю?

Memento mori

...Да помнікаў раней не дакупіца. І не таму, што дорага (грошы яшчэ палова бяды), — не знайсці сам камень!

Мусіць, таму, знайшоўшы, многія ўдовы (удаўцы) выбівалі на ім не толькі прозвішча-імя, даты жыцця памерлага, але і свае...

Што, вядома ж, добра: па-першае, потым меней клопату дзецям; па-другое, самому спакайней — ведаеш месца... Па-трэцяе, на свой густ можаш абгародку паставіць і любімых кветак насадзіць. Як цётка Галя, напрыклад.

Яна ўдавой гадоў з 20 жыве. Што важна, з клопатам пра іншых — і сваіх, і чужых.

Вось і яны, тыя людзі, з пашанай да яе. Надоечы праз раённую газету з днём народзін павіншавалі, пажадалі ўсяго. І тым самым столькі шуму паднялі — тэлефон у цёткі, можна сказаць, не змаўкаў: «знайшліся» былыя вучні, знаёмыя, аб'явілася далёкая радня... Не кажучы ўжо пра блізкую.

Адна з дачніц (новых сябровак) не ведала, што рабіць. З аднаго боку, ну вядома ж, трэба схадзіць, павіншаваць чалавека. А з іншага... «Раёнка» выходзіць рэдка. Вось і разбярыся, калі, у які дзень ісці? Загадзя, кажуць, нельга, пазней — няёмка...

Муж яе выручыў. Сказаў:

— Пяць хвілін — і я ўсё буду ведаць.

— Адкуль? — не паверыла жонка.

А муж — проста знік. І мігам вярнуўся. Сказаў:

— Ідзі, віншуй — дзень нараджэння сёння.

— ?!

— У яе на помніку напісана. Я на могілках быў.

...Нехта недурны сказаў, што пра смерць варта помніць заўсёды.

Для таго, каб лепей пражыць жыццё.

Шлях, які дай бог прайсці

Урок беларускай: той, хто хоча засвоіць, можа намаляваць — ці ўявіць — прамавугольнік (як бы дом зверху).

Дык вось: унутры яго чатыры *куты* (месцы, дзе вешаюць іконы, саджаюць маладых, ставяць непаслухмяных дзетак); звонку яны ж — чатыры *вуглы* (там «прыбіваюць» нумары дамоў, шыльдачкі «Тут жыве ветэран ВАВ»); трохі паводдаль — зноў жа чатыры, але *рагі* (месцы, дзе ў вёсках саджаюць бэз ці язмін, дзе ў гарадах размяшчаюць шапікі, дзе пачынаюцца спатканні-расставанні).

Такім чынам — сталіца, раніца, дом і сцежка, напарадзе ў нас — маладзічка. Відаць, вельмі спяшаецца, бо ледзь не бяжыць... І пры гэтым — на рагу — спыняецца, задзірае галаву на нейчыя вокны, махае рукой, а потым і зусім — прыкладае руку да сэрца, як бы «дастае» і з далонькі здзьмухвае ўверх...

Цікава паглядзець, куды і каму? Але ж гэта наўрад ці магчыма, бо дом высачэзны. Ды і якая розніца, калі...

Каханне, па словах вялікіх, — гэта хвароба, рай, падарунак нябёс, узнагарода; гэта — самы кароткі шлях ад сэрца да сэрца і такое ж мастацтва, як музыка; гэта спаборніцтва, хто болей даставіць радасці свайму чалавеку і спосаб пазбегнуць адзіноты; гэта — адно адзінае, да чаго нам трэба імкнуцца, калі з усіх людзей на зямлі патрэбен адзін!

Валянціна ДОЎНАР.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
3 красавіка 2024 г. № 13 (746)
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

«ПАТРЭБЕН ВЫНІК! ЛЮДЗІ ЗВЯРНУЛІСЯ — ЗРАБІЦЕ»

З якімі пытаннямі прыходзілі да Наталлі КАЧАНАВАЙ падчас асабістага прыёму грамадзян

У насычаным працоўным графіку Старшыні Савета Рэспублікі асаблівае месца адведзена рабоце са зваротамі насельніцтва. Веданне праблем людзей знутры дазваляе прымаць канкрэтныя, у тым ліку заканадаўчыя, рашэнні. Часта скарга аднаго чалавека агаляе сур'ёзныя недахопы ў той ці іншай сферы дзейнасці, якія аператыўна ліквідуюцца. Аказваючы дапамогу грамадзяніну, сенатары паляпшаюць сітуацыю ў цэлым, і праблемы, якія спелі гадамі, перастаюць непакоіць людзей.

Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Асабістыя прыёмы грамадзян сталі брэндам верхняй палаты парламента. Жыхары ўсіх рэгіёнаў краіны імкнуцца сустрэцца з членамі Савета Рэспублікі, асабіста са спікерам, бо давяраюць заканадаўцам. Аб гэтым сведчыць і прыём грамадзян, які Наталля Качанава праводзіла 27 сакавіка ў Савеце Рэспублікі.

За валакіту прыцягнуць да адказнасці

Мінчанка Наталля Рыгораўна расказала, што восенню яе кватэру затапілі суседзі, аднак дагэтуль не ліквідаваны наступствы затаплення: страхавая кампанія ўскладае фінансавыя выдаткі на ЖЭС, а ЖЭС — на страхавую кампанію. Дагэтуль не складзены каштарыс на рамонтныя работы.

Як патлумачыў намеснік старшыні Мінгарвыканкама Алег Корзун, які прысутнічаў на прыёме грамадзян, гэтая паслуга платная.

— Гэта ж не яе віна, а суседзяў — значыць, яны і павінны плаціць, — лічыць Наталля Качанава і ўдакладняе, дзе прапісана такое правіла. У сувязі з гэтым спікер паставіла задачу перагледзець адпаведны нарматыўна-прававы акт. «Па-першае, там дакладна павінна быць прапісана, на працягу якога часу складаецца гэты каштарыс, — канкрэтызавала сваё даручэнне Старшыня Савета Рэспублікі. — Калі Міністэрствам жыллёва-камунальнай гаспадаркі не прапісана, то гэта сумна. Магчыма, трэба ўнесці пэўныя карэктывы. Паглядзіце зыходзячы з практыкі».

На працягу чатырох месяцаў Наталля Рыгораўна звярталася ў шэраг інстанцый, аднак яе пытаннем ніхто не хоча займацца. «Я на вашым месцы ўжо ў яе пабыла б і пытанне зняла, — заўважыла спікер, звяртаючыся да намесніка старшыні Мінгарвыканкама. — Трэба прыцягнуць да адказнасці вінаватых у валакіце. Разбярыцеся! Думаю, вы вырашыце гэта пытанне».

Наталлі Рыгораўне Старшыня Савета Рэспублікі паабяцала, што пытанне возьме на кантроль. Заяўніца падзякавала за дапамогу і папрасіла прабачэння за тое, што адрывае ад больш важных пытанняў, якімі займаецца Савет Рэспублікі, але ў жанчыны склалася безвыходная сітуацыя, якую яна ахарактарызавала як крык душы.

Рамонт пасля рамонту?

На няякасны капітальны рамонт шматпавярховага дома па вуліцы Чарвякова ў сталіцы паскардзілася Алена Васілеўна, якая прадстаўляе інтарэсы ўсіх жыхароў. Жанчына расказала, што работы былі завершаны ў снежні 2023 года, аднак здадзены дом, па словах заяўніцы, з грубымі парушэннямі тэхналогій, у выніку чаго ў пад'ездзе асыпаецца фарба, па фасадзе пайшлі расколіны, ёсць праблемы з каналізацыяй. Большая частка работ, заяўленых у праекце, увогуле не выканана.

— Многія віды работ праводзіліся ў зімні час года, — удакладніла заяўніца. — Дах перасцілалі ў снегапады, у дажджлівае надвор'е фарбавалі фасады. Цяпер у жыхароў кватэр з'яўляецца цвіль. Гэта катастрофа! Мы не ведаем, што рабіць.

Намеснік старшыні Мінгарвыканкама Алег КОРЗУН пагаджаецца, што некаторыя праблемы ў гэтым доме звязаны з тым, у які час года праводзіліся пэўныя віды работ. «Гэтыя недахопы мы бачым, — падкрэсліў ён. — Пастаўлена задача да 30 красавіка іх выправіць».

Па словах Наталлі Качанавай, спяшацца не трэба. «Справа ў тым, што калі з'явілася цвіль у кватэрах, то гэта праблема, — заўважыла яна. — Вам трэба паглядзець больш дэталёва, чаму яна з'явілася. Цвіль — гэта сур'ёзна».

Спікер звярнула ўвагу на тое, што, калі пэўнай арганізацыяй выконваюцца рамонтныя работы, ёсць людзі, якія вядуць тэхнічны нагляд і падпісваюць працэнтоўку. «Яны бачылі, што робіцца дрэнна, і не маглі прыпыніць работы, а гэта — дзяржаўныя грошы, — адзначыла Старшыня Савета Рэспублікі. — За чый кошт цяпер будуць ліквідоўваць недахопы?»

Рэзюмуючы, Наталля Качанава запэўніла, што спецыялісты разбяруцца ў сітуацыі, выправяць няякасныя работы. Таксама спікер паставіла задачу — прыцягнуць да адказнасці вінаватых. Па словах намесніка старшыні Мінгарвыканкама, дырэктар арганізацыі, якая выконвала рамонт у жылым доме па вуліцы Чарвякова, быў вызвалены ад займанай пасады. Таксама ён дадаў, што гарадскія ўлады ад людзей не хаваюцца, а сустракаюцца з імі, адказваюць на пытанні.

«Можна сустракацца тысячу разоў, а выніку няма, — падкрэсліла спікер. — Патрэбен вынік! Людзі звярнуліся — зрабіце».

(Заканчэнне на 8-й стар.)

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

Міжпарламенцкае ўзаемадзеянне і стасункі з моладдзю

Падрабязнасці працоўнага тыдня членаў Савета Рэспублікі

• Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Міжпарламенцкай Асамблеі СНД (МПА СНД) па пытаннях абароны і бяспекі Фелікс Яшкоў прыняў удзел у пасяджэннях Пастаяннай камісіі МПА СНД і Аб'яднанай камісіі пры МПА СНД па гарманізацыі заканадаўства бяспекі і супрацьдзеянні новым выклікам і пагрозам у рэжыме відэа-канферэнц-сувязі. Члены Пастаяннай камісіі Асамблеі завяршылі работу над праектам Рэкамендацыі па ўдасканаленні прававога рэгулявання дзейнасці пагранічных ведамстваў дзяржаў — удзельніц СНД у сферы процідзеяння тэрарызму. Прыняцце Рэкамендацыі дасць магчымасць зблізіць падыходы да тлумачэння палажэнняў нарматыўных прававых актаў у сферы процідзеяння тэрарызму, забяспечыць дастаткова аднастайнае і сістэмнае рэгуляванне адносін у гэтай сферы. Акрамя таго, члены Пастаяннай камісіі абмеркавалі канцэпцыю праекта мадэльнага закона «Аб аператыўна-вышуковай дзейнасці». У новай рэдакцыі мадэльнага закона ўлічаны сучасныя тэндэнцыі ў сферы ажыццяўлення аператыўна-вышуковай дзейнасці, вопыт прававога рэгулявання грамадскіх адносін у гэтай галіне ў дзяржавах — удзельніцах СНД і практыка яго прымянення. Абмеркаваны праекты канцэпцый мадэльных законаў «Аб навігацыйным забеспячэнні» і «Аб тэрытарыяльнай абароне».

• Савет Рэспублікі наведалі выкладчыкі, студэнты і магістранты юрыдычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Для ўдзельнікаў сустрэчы былі арганізаваны экскурсія па будынку Савета Рэспублікі і агляд музейнай экспазіцыі. У зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі яны азнаёміліся з асноўнымі напрамкамі дзейнасці верхняй палаты парламента, кампетэнцыяй пастаянных камісій Савета Рэспублікі, парадкам і асаблівасцямі работы над законапраектамі. Ад удзельнікаў мерапрыемства паступіў шэраг пытанняў, якія датычацца ўдасканалення заканадаўства, стадый заканатворчасці, уцягвання моладзі ў грамадска-палітычнае жыццё краіны, работы са зваротамі грамадзян.

• Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, старшыня Гомельскай абласной арганізацыі рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Беларускае таварыства Чырвонага Крыжа» Ала Смаляк сустрэлася ў Гомелі з групай дзяцей з Херсонскай вобласці, якія прайшлі аздараўленне ў дзіцячым рэабілітацыйна-аздараўленчым цэнтры «Лясная паляна» ў Гродзенскай вобласці. Па дарозе дадому хлопцы і дзяўчаты спыніліся ў горадзе над Сожам. Ала Смаляк пацікавілася, ці спадабаўся ім адпачынак, што запомніцца больш за ўсё. Сенатар адрасавала дзецям словы падтрымкі, пажадала дабра і дабрабыту, уручыла падарункі. «За два тыдні адпачынку на гасціннай беларускай зямлі дзеці з Херсонскай вобласці прайшлі не толькі аздараўленне, але і атрымалі добрыя эмоцыі, новыя цікавыя знаёмствы, а галоўнае, змаглі паглыбіцца ў атмасферу бесклапотнага дзяцінства, — падкрэсліла парламентарый. — Як прызналіся самі хлопцы і дзяўчаты, з сабой яны вязуць толькі самыя цёплыя і добрыя ўспаміны аб нашай краіне і мараць зноў прыехаць у Беларусь».

Вераніка КАНЮТА.

«ПАТРЭБЕН ВЫНІК! ЛЮДЗІ ЗВЯРНУЛІСЯ — ЗРАБІЦЕ»

(Заканчэнне. Пачатак на 7–й стар.)

Мінчанка таксама ўзняла пытанне асвятлення агульнадамавой плошчы. І днём, і ноччу ў пад'ездзе гарыць святло — так працуюць сучасныя сістэмы асвятлення, якія жыхарам паставілі падчас капрамонту. Аднак людзей гэта, натуральна, не задавальняе: чаму яны павінны пераплачваць за нерацыянальнае выкарыстанне электрычнасці? Акрамя таго, жыхароў хвалюе праблема каналізацыі: яшчэ да капрамонту падвалы рэгулярна падтапляліся, нічога не памянялася і цяпер. Наталля Качанава лічыць заўвагі слушнымі. Мясцовым органам улады даручана вырашыць гэтыя пытанні ў найбліжэйшыя дні.

Рэзюмуючы, Старшыня Савета Рэспублікі нагадала сваю просьбу — стварыць у кожным доме дамавы камітэт або савет, які меў бы прамую сувязь з мясцовымі органамі ўлады. «І не трэба было б хадзіць па інстанцыях: пытанні вырашаліся б імгненна, — патлумачыла спікер. — Ёсць людзі актыўныя, якія гатовы адстойваць інтарэсы іншых. Гэтыя формы і метады работы з людзьмі даўно сябе добра зарэкамендавалі. Дзе так ёсць, там і работа зладжаная. Я ведаю, што гэта дае вынік. Добры вынік».

Машына-месца ёсць, а карыстацца ім нельга

Іна Васілеўна расказала, што ў 2022 годзе купіла ў Мінску кватэру. У кошт квадратнага метра ўваходзіла і машынамесца ў паркінгу. Аднак калі ключы ад кватэр жыхары шматпавярховіка атрымалі своечасова, то паркінгам карыстацца яны дагэтуль не могуць. Справа ў тым, што дом знаходзіцца на балансе ЖЭСа, які, як патлумачылі жыхарам, не мае права абслугоўваць паркінгі. Заключаць дагавор з таварыствам уласнікаў гаспадары кватэр не хочуць, бо давяраюць дзяржаўнай арганізацыі.

— Колькі ў доме жыхароў? — пацікавілася Наталля Качанава.

— У кожным з двух дамоў — па 118 кватэр, — паведаміла Іна Васілеўна.

— І кожны аплаціў машына-месца ў паркінгу? — удакладніла спікер.

— Так.

Па словах намесніка старшыні Мінгарвыканкама Аляксандра Чэрнікава, на цяперашні момант паркінг нікому не могуць перадаць на абслугоўванне, ён агароджаны, зачынены. «Людзі не зацікаўлены ў стварэнні таварыства ўласнікаў», — дадаў ён. Што датычыцца перадачы паркінга на баланс ЖЭСа, то гэта, як патлумачыў намеснік міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі Андрэй Рамашка, не прадугледжана заканадаўствам, бо паркінгі не з'яўляюцца іх аб'ектамі. «На жаль, сёння няма механізму прававога налічэння праз рахунак-апавяшчэнне спажыўцам выдаткаў на ўтрыманне менавіта гэтага аб'екта», — удакладніў ён.

— Гэта бязладдзе, што вы дагэтуль не можаце разабрацца з такімі пытаннямі, — звярнула ўвагу Старшыня Савета Рэспублікі. — Збіраемся, праводзім нарады, экспертныя саветы, на якіх я прашу ўносіць прапановы, якія ідуць ад жыцця, што яшчэ трэба ўрэгуляваць. Усе сядзяць — маўчаць. Як толькі разбіраюцца канкрэтныя пытанні, яны ўсплываюць соты раз. Сёння мы ідзём да таго, што дамы будуць абслугоўвацца ЖКГ. Калі паркінг знаходзіцца каля дома, трэба, каб і яго абслугоўвала ЖКГ, што ўжо даўно павінна было быць унесена ў нарматыўна-прававыя акты. Тады, калі людзі будуюць жыллё і вы абавязваеце іх будаваць паркінгі, трэба ўрэгуляваць пытанне заканадаўча, хто ў далейшым будзе займацца абслугоўваннем гэтых збудаванняў. Людзі не павінны ад гэтага пакутаваць. Гэтае пытанне павінна быць вырашана!»

Будоўля з наступствамі для іншых

Вячаслаў Алегавіч, які прыехаў на прыём грамадзян з Віцебска, прадстаўляў інтарэсы і свайго суседа — Івана Уладзіміравіча. Ён расказаў, што ў 2022 годзе побач з іх прыватнымі дамамі пачалі ўзводзіць шматпавярховік. У ходзе будаўнічых работ маёмасці гаспадарам двух прыватных дамоў была нанесена шкода. «У нас на сценах пайшлі расколіны, — канкрэтызаваў Вячаслаў Алегавіч. — У суседа перакасіўся гараж. У маім гаражы — расколіны ў сантыметр».

«Вы ўжо кудысьці звярталіся па гэтым пытанні?» — удакладніла Наталля Качанава.

Віцябчанін расказаў, што з просьбай выправіць недахопы яны куды толькі ўжо не звярталіся. «Нам сказалі, што без правядзення незалежнай экспертызы ніякіх работ у нашых дамах праводзіць не будуць, — паведаміў мужчына. — Мы правялі такую экспертызу. У суседа дом застрахаваны, таму страхавая кампанія выплаціла яму грошы. Аднак за гэтыя капейкі, якія яму налічылі, ён нічога не можа зрабіць. Мне ўвогуле сказалі, што ніякай кампенсацыі не будзе».

«Гэта паводле генплана такая забудова каля індывідуальнага жылля?» — удакладніла Старшыня Савета Рэспублікі ў першага намесніка старшыні Віцебскага аблвыканкама Анатоля Ліневіча, які прысутнічаў на прыёме.

«Так, паводле генплана. На гэтым месцы будуюць інтэрнат, ужо ўзведзена шэсць паверхаў», — паведаміў ён. Анатоль Ліневіч праінфармаваў, што наведаў жыхароў прыватных дамоў, азнаёміўся з праблемай і цяпер разбіраецца, як яе можна вырашыць. «Калі ў перспектыве па генплане ў гэтым месцы прадугледжана шматпавярховая забудова, то будзе разглядацца пытанне аб выдзяленні зямельнага ўчастка для будаўніцтва жылля», — сказаў першы намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама.

Па словах Наталлі Качанавай, падчас праектавання трэба было ўлічваць, што побач са шматпавярховікам, які плануецца пабудаваць, — не новыя дамы. «Трэба разбірацца, — рэзюмавала спікер. — Уважліва вывучце сітуацыю і прыміце правільнае рашэнне. Дапамажыце людзям!» Адпаведныя даручэнні дадзены Віцебскаму абласному выканаўчаму камітэту.

Вераніка КАНЮТА.

Інфармацыя павінна быць актуальнай

Дыялог з актывістамі, якія лепш, чым хто, ведаюць праблемы і пытанні мясцовых жыхароў

На Гомельшчыне прадуктыўнай і папулярнай формай работы раённых дэпутацкіх карпусоў застаюцца дыялогавыя пляцоўкі з актывамі сельсаветаў. У такім фармаце абмяркоўваюцца як актуальныя пытанні сацыяльна-эканамічнага развіцця раёна, рэгіёна, так і краіны ў цэлым. Старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў Кацярына ЗЕНКЕВІЧ узначаліла дыялогавую пляцоўку з актывам Лоеўскага раёна. Задаць хвалюючыя пытанні кіраўніку аблсавета змаглі дэпутаты базавага і першаснага ўзроўняў раёна.

У дыялогавай пляцоўцы ўзялі ўдзел старшыні ўсіх сельсаветаў Лоеўшчыны і актыў Ручаёўскага сельсавета, на базе якога і прайшла сустрэча.

Кацярына Зенкевіч падрабязна расказала пра сацыяльна-эканамічнае развіццё вобласці, знешнеэканамічную дзейнасць у рэгіёне, вытворчасць прамысловай і харчовай прадукцыі, сферу будаўніцтва.

— Трэба разумець, што ад таго, наколькі адказнымі будуць адносіны да працы кожнага на сваім працоўным месцы, залежыць канкурэнтаздольнасць айчынных тавараў і паслуг, а значыць, узровень дабрабыту краіны і людзей, — падкрэсліла старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў.

Кацярына Зенкевіч засяродзіла ўвагу дэпутатаў на выкарыстанні сродкаў абласнога бюджэту для падтрымкі сацыяльнай сферы.

— За кошт гэтых сродкаў стабільна функцыянуюць установы адукацыі, аховы здароўя, культуры, ажыццяўляецца добраўпарадкаванне населеных пунктаў, — нагадала старшыня аблсавета. — Мы павінны больш тлумачыць людзям, колькі дзяржаўных сродкаў укладваецца, каб забяспечыць дастойны ўзровень жыцця, і чаму важны ўклад кожнага чалавека. Любы жыхар можа браць удзел у грамадскім жыцці, асабліва ў навядзенні парадку. Як сказаў Прэзідэнт, Год якасці пачынаецца са свайго двара. Задача ўлады — арганізаваць людзей, стварыць ім умовы, магчымасці для ўдзелу ў добраўпарадкаванні тэрыторый, дзе тыя пражываюць. Да гэтай работы абавязкова павінны падключацца мясцовыя органы ўлады, — падкрэсліла старшыня аблсавета і заклікала дэпутатаў да ўзмацнення сумеснай работы з мясцовымі органамі ўлады, кіраўнікамі прадпрыемстваў і арганізацый.

Як было адзначана, сёлета Гомельскі абласны Савет дэпутатаў працягне навучальную і інфармацыйную работу з дэпутатамі базавага ўзроўню. Кацярына Зенкевіч нагадала дэпутатам, што неабходна звярнуць увагу на афармленне інфармацыйнай прасторы ў сельсаветах: стэнды, дошкі аб'яў, сайты. Інфармацыя павінна быць актуальнай. Вядома, неабходна цесна супрацоўнічаць з прадстаўнікамі мясцовых сродкаў масавай інфармацыі, рэгулярна дзяліцца навінамі, у тым ліку аб праведзенай рабоце. Лідар дэпутацкага корпуса Гомельшчыны заклікала працягваць такія важныя формы работы на месцах, як «Дзень дэпутата», «Дзень сельсавета».

— Неабходна рэгулярна праводзіць вучобы дэпутатаў па розных пытаннях, прыцягваць для гэтага вузкіх спецыялістаў. Напрыклад, па зваротах грамадзян — прыцягваць да работы прадстаўнікоў аддзела па зваротах райвыканкама, па распараджэнні маёмасцю — аддзела эканомікі, — зазначыла старшыня аблсавета.

Пасля дыялогавай пляцоўкі Кацярына Зенкевіч разам са старшынёй Лоеўскага раённага Савета дэпутатаў Ірынай Пастуховай і дэпутатам аблсавета Тамарай Дземідзенка азнаёміліся з работай аб'ектаў сацыяльна значнай інфраструктуры на тэрыторыі аграгарадка Ручаёўка. Дэпутаты наведалі Ручаёўскую сярэднюю школу імя Мельнікава, дзіцячы садок, сельскую бібліятэку, фельчарска-акушэрскі пункт.

— Сёння на абслугоўванні — больш за 350 чалавек. Вядзём патранаж дзяцей да года, цяжарных жанчын, грамадзян з інваліднасцю. Праводзім дыспансернае назіранне пацыентаў, вакцынацыю. Забяспечваем работу працэдурнага кабінета і аптэкі, — патлумачыла **загадчык Ручаёўскага фельчарска-акушэрскага пункта Яна ГРУШЭНКА**.

На вёсцы сацыяльна значным аб'ектам, безумоўна, застаецца пошта.

— Прыходзяць атрымаць пенсію, аформіць падпіску, аплаціць сотавую сувязь і камунальныя паслугі, набыць тавары штодзённага попыту, — расказала **начальнік мясцовага аддзялення паштовай сувязі Анастасія КАЦУБА**.

Дэпутаты таксама пацікавіліся, як у аграгарадку развіваецца гандаль, і аценілі асартымент прадукцыі ў краме індывідуальнага прадпрымальніка.

Падчас наведвання кожнага сацыяльна значнага аб'екта дэпутаты цікавіліся, як аказваюцца паслугі з улікам попыту вяскоўцаў.

— У раёне працягваюць праводзіць мэтанакіраваную работу па выкананні сацыяльных стандартаў. Таму на асаблівым кантролі дэпутатаў — даступнасць і своечасовасць паслуг, якія аказваюцца жыхарам сельскіх населеных пунктаў, — адзначыла **старшыня Лоеўскага раённага Савета дэпутатаў Ірына ПАСТУХОВА**.

Па выніках работы ў Лоеўскім раёне Кацярына Зенкевіч у чарговы раз адзначыла ролю дэпутатаў пярвічнага ўзроўню ў рабоце з насельніцтвам на месцы, у вырашэнні пытанняў, якія маюць надзённы характар і хвалююць жыхароў сельскіх населеных пунктаў.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.
Фота газеты «Лоеўскі край».

ЭНЕРГІЯ РАЗВІЦЦЯ

Чым жыве самы малады раён Гродзеншчыны

Адносна нядаўна Астравецкі раён нічым не вылучаўся сярод іншых раёнаў Гродзенскай вобласці. Але з пачаткам будаўніцтва Беларускай атамнай электрастанцыі ён стаў вядомы далёка за межамі Беларусі. Цяпер Астравец — горад беларускіх атамшчыкаў. Аб тым, як змяніўся раён і наколькі ён стаў прывабным для жыцця, карэспандэнту «Звязды» расказаў старшыня Астравецкага раённага Савета дэпутатаў Генадзь БЫЧКО, які ведае ўсё не па чутках — да нядаўняга часу Генадзь Паўлавіч працаваў на пасадзе намесніка старшыні Астравецкага райвыканкама амаль пяць гадоў.

— Генадзь Паўлавіч, апошні этап будаўніцтва Беларускай атамнай электрастанцыі ішоў, як кажуць, на вашых вачах. Якія значныя змены адбыліся за гэты тэрмін у Астравецкім раёне, наколькі павялічылася якасць жыцця людзей?

— Упершыню я наведаў гэты раённы цэнтр вясной 2012 года. Працаваў тады ў суседнім Смаргонскім раёне таксама намеснікам старшыні райвыканкама. Мне цікава было пабачыць, як жывуць суседзі. Тады праехаць Астравец на машыне можна было за вельмі невялікі час. І як я здзівіўся, калі праз некалькі гадоў на ўездзе ў Астравец убачыў новы мікрараён з прыгожымі шматпавярховымі дамамі! Прычым гэта быў толькі пачатак вялікай будоўлі. Новыя мікрараёны з'яўляліся ў раённым цэнтры адзін за другім. Прычым яны не падобныя паміж сабой. Відавочныя старанні архітэктараў, якія маглі выкарыстоўваць свае творчыя магчымасці. У гэтым, на мой погляд, і заключаецца асноўная адметнасць горада.

Я вельмі ўдзячны горада-будаўнікам, што яшчэ на этапе праектавання былі прадугледжаны ўсе неабходныя аб'екты сацыяльнай інфраструктуры. Магазіны, школы, дзіцячыя садкі, паліклінікі, пункты грамадскага харчавання, спартыўныя аб'екты — усё, як кажуць, у крокавай даступнасці. Створаны ўсе ўмовы для камфортнага і зручнага жыцця грамадзян. Як кажуць: сёння ў Астраўцы няма толькі метро і касмадрома. А калі жартам пытаюцца, чаму я забыўся пра аэрадром, адказваю, што вуліца Аэрадромная ў райцэнтры ёсць.

Мадэрнізаваны гарадскі стадыён з цудоўным штучным пакрыццём. У 2020 годзе адчыніў свае дзверы новы спартыўна-аздараўленчы комплекс «Імпульс». Гэта — сапраўдны гонар раёна. Сучасны двухпавярховы будынак са шматфункцыянальнай спартыўнай залай, трэнажорным памяшканнем, басейнам. У гэтым комплексе праводзяцца шматлікія спартыўныя спаборніцтвы рознага ўзроўню. У маі 2023 года пачала дзейнічаць і хакейная пляцоўка. Пры дапамозе нашых партнёраў з «Расатама» пабудаваны цудоўны баскетбольны стадыён. Сёння кожная астравецкая школа мае сваю добрую спартыўную базу. Як бачыце, кожны чалавек, нягледзячы на ўзрост, знойдзе магчымасць займацца сваім любімым відам спорту.

У Астраўцы існуюць і культурныя цэнтры, дзе вядзецца разнастайная гурткоўая дзейнасць. Ёсць памяшканне для заняткаў боўлінгам. Можна арандаваць веласіпеды, байдаркі. Спартыўная інфраструктура створана на самым высокім узроўні. У нас і краявіды вакол прыгожыя. Ёсць усе магчымасці для турыстычных вандровак. Можна адпачываць на рэках і азёрах, лавіць рыбу, збіраць дзікаросы. Дарэчы, нашы мясціны вельмі падобныя на карэльскія. Адным словам, сумаваць у Астраўцы не прыйдзецца.

Хачу дадаць, што змяніўся не толькі сам горад, але і аграгарадкі раёна. Дзякуючы таму, што ў апошнія гады раённы бюджэт быў прафіцытным і мы абходзіліся без дзяржаўных датацый, надавалася ўвага і невялікім населеным пунктам: асфальтаваліся вясковыя вуліцы, ажыццяўлялася іх добраўпарадкаванне, праводзіўся капітальны і бягучы рамонт жыллёвага фонду, удасканальвалася сацыяльная інфраструктура вёсак...

— У сувязі са з'яўленнем на тэрыторыі раёна ўнікальнага энергетычнага аб'екта, з пашырэннем тэрыторыі райцэнтра, актыўным жыллёвым будаўніцтвам хачу спытаць, як за апошні час змяніўся склад насельніцтва, ці выклікала гэта актыўны прыток моладзі ў раён?

— Само будаўніцтва Беларускай АЭС мела на ўвазе вялікі прыток будаўнікоў, гэта па-першае. Па-другое, чакаўся прыезд пэўнай колькасці спецыялістаў-энергетыкаў, якім у будучыні трэба было абслугоўваць станцыю. Улічваючы спецыфіку аб'екта, да нас прыбылі энергетыкі не толькі з розных куткоў Беларусі, але і з іншых былых рэспублік Савецкага Саюза. У першую чаргу — атамшчыкі.

У працэсе будаўніцтва АЭС у Беларусі ішла падрыхтоўка ўласных спецыялістаў у галіне атамнай энергетыкі. Прычым іх рыхтавалі не толькі ў беларускіх навучальных установах, але і ў вучэбна-трэніровачным цэнтры, створаным непасрэдна пры станцыі. Справа ў тым, што навучацца і перанавучацца спецыялісты АЭС павінны рэгулярна. Нават пабываўшы ў водпуску, супрацоўнік станцыі павінен прайсці пэўны курс падрыхтоўкі, каб яго дапусцілі да работ на адказным участку. Дарэчы, сёння нашы беларускія атамшчыкі гатовы рыхтаваць спецыялістаў з замежжа для работы на іх АЭС.

Акрамя спецыялістаў-атамшчыкаў, насельніцтва Астраўца дапоўнілі ваеннаслужачыя, якія ахоўваюць станцыю, і члены іх сямей. Горад значна пашырыўся, павялічылася колькасць устаноў адукацыі, аховы здароўя, іншых аб'ектаў сацыяльнай інфраструктуры. Адпаведна выросла патрэба ў спецыялістах самых розных прафесій. Напрыклад, за апошнія гады толькі педагогаў нам спатрэбілася некалькі дзясяткаў. У раённым цэнтры пабудаваныя новыя школа і гімназія, пачала дзейнічаць новая раённая бальніца, якая атрымала статус клінічнай. У яе сценах — новае сучаснае медыцынскае абсталяванне, ёсць магчымасць выконваць складаныя хірургічныя аперацыі, а гэта, як вы разумееце, патрабуе спецыялістаў даволі высокага ўзроўню. Толькі ў 2019 годзе да нас прыбыло на першае працоўнае месца 120 маладых спецыялістаў-медыкаў.

Адзначу, што замацаванасць маладых спецыялістаў па раёне складае каля 70 %. Адным словам, наяўнасць атамшчыкаў у Астраўцы прыцягнула шмат спецыялістаў іншых прафесій. Прычым многія навасёлы прыехалі ў Астравец з сем'ямі, а некаторыя стварылі сем'і ўжо непасрэдна ў нашым раёне, растуць дзеці. На сёння наш раён — самы малады на Гродзеншчыне.

— За апошнія гады Астравец павялічыўся ў два разы і працягвае развівацца. У сувязі з гэтым хачу спытаць, што яшчэ прадугледжана планам развіцця горада беларускіх атамшчыкаў?

— Безумоўна, працэс развіцця працягваецца. У прыватнасці, планам прадугледжана будаўніцтва ў раённым цэнтры яшчэ адной агульнаадукацыйнай школы. Цяпер поўным ходам ідзе рэканструкцыя другой чаргі раённай паліклінікі. Калі першая частка аб'екта, які змяшчаецца на базе былой раённай бальніцы, была здадзена ў жніўні мінулага года, то другая мадэрнізуецца самымі актыўнымі тэмпамі. Гэта будзе сучасная, цалкам абсталяваная ўстанова, дзе жыхары Астравецкага раёна змогуць атрымаць поўны комплекс разнастайных медыцынскіх паслуг. Дарэчы, шэраг паслуг нашы спецыялісты аказваюць і для жыхароў найбліжэйшых раёнаў.

Плануецца пабудаваць яшчэ некалькі шматкватэрных жылых дамоў, але для гэтага нам спатрэбіцца мадэрнізаваць гарадскія інжынерныя сеткі. А яшчэ неабходна будзе правесці рэканструкцыю кацельнай гаспадаркі, перавесці цеплавыя аб'екты на новыя віды паліва. Вялікую работу па добраўпарадкаванні давядзецца выканаць у сектары індывідуальнай забудовы. На першым плане — асфальтаванне вуліц. Працягнуцца работы па ўладкаванні паркава-рэкрэацыйнай зоны з мадэрнізацыяй гідратэхнічных збудаванняў. Адным словам, планы ў нас вялікія. Спыняцца на тым, што зроблена, мы не збіраемся.



— Астравец — гэта не толькі энергетыка. Што можна сказаць пра іншыя галіны эканомікі?

— Галоўнае прадпрыемства раёна — гэта, безумоўна, БелАЭС. Што датычыцца перапрацоўчых прадпрыемстваў, то іх у нас няма, паколькі мы з'яўляемся сыравіннай базай для суседніх раёнаў — Смаргонскага і Ашмянскага. У раёне дзейнічае пяць сельгаспрадпрыемстваў, самыя буйныя з якіх КСУП «Гудагай» і «Гервяты». Зараз яны вядуць будаўніцтва сучасных малочнатаварных комплексаў.

Астравецкі раён пастаўляе малочную сыравіну на Ашмянскі сыраробны і Смаргонскі малочны заводы, добра вядомыя не толькі ў краіне, але і за яе межамі. І ў тым, што прадукцыя гэтых прадпрыемстваў карыстаецца вялікім попытам у насельніцтва, ёсць значны ўклад астравецкіх працаўнікоў. Тое ж самае можна сказаць і аб прадуктах Ашмянскага мясакамбіната. Асноўны кірунак дзейнасці нашых сельскагаспадарчых прадпрыемстваў — раслінаводства і вытворчасць мяса-малочнай сыравіны.

Асобна хачу адзначыць дзейнасць нашай лесапераапрацоўчай прамысловасці. Астравецкі лясгас актыўна ўдзельнічае ў сумесным праекце двух лясгасаў Гродзенскай вобласці і прадпрыемства «Гроднажылбуд» па вытворчасці з бруса драўляных дамоў — цёплых, недарагіх, якія хутка ўзводзяцца. Наколькі мне вядома, гэтую прадукцыю плануецца актыўна пастаўляць за мяжу.

У раёне таксама дзейнічаюць прыватныя прадпрыемствы рознай скіраванасці.

— У Астравецкім раёне ёсць гісторыка-культурныя помнікі, існуюць цудоўныя прыродныя мясціны. Як кіраўніцтва райвыканкама мае намер развіваць турыстычны патэнцыял?

— Галоўнай гістарычнай каштоўнасцю нашага раёна з'яўляюцца мясцовыя храмы. У асноўным каталіцкія, паколькі большасць насельніцтва вызнае каталіцкую веру. Некаторыя з іх проста ўнікальныя. Знакаміты Гервяцкі касцёл невыпадкова носіць назву беларускага Нотр-Дама, бо ён вядомы ва ўсёй краіне. Цікавасць у наведвальнікаў выклікаюць і храмы ў вёсках Міхалішкі, Варняны, цудоўны драўляны храм у Кемелішках. Усе гэтыя гістарычныя помнікі ўключаны ў турыстычныя маршруты, якія праходзяць па Астравецкім раёне і карыстаюцца вялікай цікавасцю ў турыстаў.

Спрабуем развіваць і прыродны турызм, у прыватнасці звязаны з Сарачанскімі азёрамі і аднайменным заказнікам. Ёсць шэраг экалагічных маршрутаў, веласіпедных і пешаходных. Фізкультурна-спартыўны комплекс арганізуе водныя паходы на байдарках і каноэ. Гэта яшчэ адзін важны кірунак развіцця турыстычнага патэнцыялу.

На тэрыторыі раёна дзейнічае шэраг аграсядзіб, якія таксама карыстаюцца папулярнасцю ў нашых гасцей. Безумоўна, мы не з'яўляемся беларускай турыстычнай Меккай, але наш раён мае вялікую турыстычную прыцягальнасць, і мы з задавальненнем запрашаем гасцей наведаць Астравецкі раён, азнаёміцца з яго культурным і прыродным багаццем.

Гутарыў Сяргей РУЧАНАЎ.

КАБ СЮДЫ ПРЫХОДЗІЛІ ДЗЕЦІ

У адным толькі Знаменскім сельсавеце налічваецца 14 помнікаў падзеям вайны

Ледзь не кожны населены пункт нашай краіны мае сваю сумную або нават трагічную старонку гісторыі перыяду ваеннага ліхалецця. Сведчаннем таму — абеліскі, помнікі, стэлы, памятныя знакі. У адным толькі Знаменскім сельсавеце Брэсцкага раёна такіх помнікаў чатырнаццаць. Устаноўлены яны на брацкіх магілах, на месцах вайсковых пахаванняў, расстрэлаў мірных жыхароў, а таксама ў гонар землякоў-франтавікоў і ахвяр фашызму.

Са **старшынёй сельвыканкама Сяргеем ГАЛАВЕНКАМ** наведваем некаторыя помнікі ў першай палове сакавіка. Сяргей Сямёнавіч адразу папярэджвае, што ніводзін з іх яшчэ не пражыў веснавую прыборку. Але і без гэтага яны выглядаюць дагледжанымі, што сведчыць пра пастаянны клопат аб захаванні памяці. Помнікі даглядаюць школьнікі са сваімі настаўнікамі, менавіта дзякуючы ім там падтрымліваецца парадак. Не застаюцца ўбаку прадстаўнікі грамадскасці, устаноў і прадпрыемстваў, якія працуюць на тэрыторыі, проста нераўнадушныя людзі. Ну а каардынуе работу, забяспечвае сродкамі догляду, будаўнічымі матэрыяламі для касметычнага рамонту мясцовая ўлада.

— У вёсцы Страдзеч тры помнікі, у Рагозне чатыры, а ў Медне іх пяць, па адным у Знаменцы і Прылуках, — расказвае кіраўнік мясцовай улады. — Чаму столькі? Насельніцтва актыўна дапамагала партызанам. Акупанты лютавалі. Многія вясковыя людзі былі расстраляны, закатаваны. А ў 1944 годзе пры вызваленні ішлі надзвычай жорсткія баі, — працягвае Сяргей Галавенка. — Толькі ўявіць сабе: за вызваленне населеных пунктаў нашага сельсавета тры вайскоўцы Чырвонай Арміі былі ўдастоены звання Героя Савецкага Саюза! Больш не ведаю падобных прыкладаў. А ў жорсткіх баях, як вядома, бываюць вялікія страты. Байцоў і афіцэраў нярэдка хавалі тут, потым ставілі помнікі.

Спачатку памятныя знакі былі даволі простыя. З гадамі яны пражывалі рэканструкцыю, абнаўленне. Апошнім часам на многіх з іх памянялі мемарыяльныя пліты, на іх змешчана інфармацыя пра тых людзей, у гонар якіх устаноўлены помнікі. Дарэчы, нядаўна з'явіліся і таблічкі з QR-кодамі.

Варта ўлічыць яшчэ той факт, што ў Брэсцкім раёне праходзіць дзяржаўная граніца. Тады, у чэрвені 1941 года, першымі з нападам ворага сутыкаліся пагранічнікі, многія з іх, на жаль, загінулі. У Знаменскім сельсавеце таксама ўвекавечаны подзвіг пагранічнікаў. На сціплым абеліску накрэслены тры прозвішчы вартавых граніцы, якія ўдалося ўстанавіць, а яшчэ тры іх баявыя таварышы значацца як невядомыя. Цікава, што абеліск устаноўлены побач з брацкай магілай воінаў, якія загінулі тут у гады вайны. А калі памятныя знакі ўзводзілі, падымалі дакументы, апытвалі сведак, знайшлі інфармацыю аб па-зверску закатаваных тут вяскоўцах. Іх памяць таксама вырашылі ўвекавечыць. У якасці помніка зрабілі кампазіцыю ў форме зруба вясковай хаты на падмурку. На апошнім умацавалі мармуровую пліту з прозвішчамі сямі ахвяр фашызму. Такім чынам утварылася адзіная памятная мясціна з трох памятных знакаў. Да яе вядзе сцяжына, абсаджаная дэкаратыўнымі кустамі. Хутка тут будзе прыбрана мінулагоднее лісце і з'явяцца кветкі.

Помнік у гонар 86 чалавек, расстраляных фашыстамі ў Страдзечы, абнеслі невысокай цаглянай агародкай. Каля падножжа яго ўстаноўлена шэсць мемарыяльных табліц з імёнамі ахвяр. У кожнага з гэтых абеліскаў — свая трагічная гісторыя.

Пра адну з іх расказала настаўніца Меднаўскай сярэдняй школы, захавальніца школьнага музея Ала Карабейка. Ала Пятроўна падхапіла эстафету школьных пошукавых клопатаў ад свайго бацькі Пятра Данілавіча. Ён у свой час стварыў гэты музей, збіраў экспанаты і матэрыялы. Пётр Карабейка апытаў многіх аднавяскоўцаў, запісаў іх расповеды. Нават праз раённую газету прасіў адгукнуцца відавочцаў, і яны знаходзіліся. Такім чынам сабралася бясцэнная калекцыя сведчанняў вясковых людзей пра падзеі таго часу.

Побач са школай стаіць помнік сям'і з Меднаў, якую расстралялі за сувязь з партызанамі. Іх прозвішча Мароз. Ад рук акупантаў загінула восем чалавек — тры пакаленні... І не толькі гэтая сям'я знайшла тут спачын. Разам з імі расстралялі настаўніцу Манефу Бабарыкіну. Яна прыехала ў 1939 годзе з Расіі, вучыла вясковых дзяцей у Медне. Да таго ж Манефа была яўрэйкай. З прыходам немцаў яна хавалася ў добрых людзей у Страдзечы. Але ж знайшоўся злыдзень, выдаў яе акупантам.

Людзі запомнілі той расстрэл. Спачатку забілі Марозавых, скінулі ў яму. Пасля гэтага расстрэльная каманда, хутчэй за ўсё, адразу з'ехала, а тут прывезлі настаўніцу. Нямецкі афіцэр выстраліў у маладую жанчыну, затым скінуў з рук пальчаткі, кінуў іх у яму ўслед за ёй і сказаў: «Маёй віны тут няма», тым самым хацеў пераадрасаваць адказнасць у бок даносчыкаў, фашысцкіх прыслужнікаў і памагатых...

На месцы расстрэлу да нядаўняга часу стаяў дубовы крыж. Клопатамі мясцовай улады побач устаноўлены камень-валун з мемарыяльнай дошкай. А школьны музей нядаўна перажыў рэканструкцыю і абнаўленне. Пад экспазіцыю адведзена цэлае крыло школы, утворана некалькі залаў. Цяпер тут праходзяць урокі краязнаўства, урокі мужнасці.

Паводле слоў старшыні сельвыканкама, у красавіку ўсе помнікі будуць прыбраны і дагледжаны, побач пасадзяць кветкі: «Там, дзе дазваляе месца, высаджваем дэкаратыўныя кусты і нават цэлыя памятныя алеі. Работа будзе працягвацца, каб памятныя мясціны выглядалі годна. Сюды мы прыходзім у Дзень Перамогі, у дні дзяржаўных свят, аддаём даніну пашаны героям-франтавікам і бязвінным ахвярам вайны. Асабліва важна, што сюды прыходзяць дзеці і моладзь», — сказаў кіраўнік мясцовай улады.

> «Сюды мы прыходзім у Дзень Перамогі, у дні дзяржаўных свят, аддаём даніну пашаны героям-франтавікам і бязвінным ахвярам вайны. Асабліва важна, што сюды прыходзяць дзеці і моладзь».

Святлана ЯСКЕВІЧ.
Фота аўтара і Меднаўскай сярэдняй школы.

Брэсцкі раён.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 3820000007667 ад 03.04.2004. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 11.695. **Нумар падпісаны ў 19.30 2 красавіка 2024 года.**

«Кураслеп рассыпаў па ёй сваё тлустае золата...»

Веснавыя кветкі на старонках літаратурных твораў

Прыгрэла сонейка.
На ўзлеску
Птушыны спеў
Чуваць здаля...
Стаіць і слухае пралеска,
Як ціха
Дыхае зямля.

У задуменна-лірычным вершы Авяр'яна Дзеружынскага пяшчотная веснавая кветка — увасабленне мудрасці прыроды.

Шмат каго з беларускіх паэтаў і пісьменнікаў натхнялі шматлікія першацветы... Але ж ці ведаем мы іх сапраўдныя назвы? Пралескамі найчасцей называем белы кураслеп дуброўны і сінюю пралеску высакародную, менавіта яны найчасцей утвараюць прыгожыя кветкавыя дываны ўвесну... Многія з нас імкнуцца ўласнаручна сарваць пяшчотныя першыя кветачкі, прынесці ў хату сведчанне таго, што зямля абудзілася ад зімовага сну... Але тым самым мы наносім шкоду прыродзе. Лепей любавацца гэтымі вонкава пяшчотнымі, а насамрэч вельмі трывалымі раслінамі, якія мужна пераадольваюць халады, у лесе, на лузе... Можна паназіраць за імі і на старонках літаратурных твораў.

Прадвеснікі Перамогі

Максім Танк напісаў верш «Пралескі» ў 1944-м годзе, калі быў далёка ад захопленай ворагам радзімы і працаваў у франтавой газеце «За савецкую Беларусь». Беларускі штаб партызанскага руху ў той час знаходзіўся ў Падмаскоўі, часта бываў паэт і ў Маскве. Магчыма, там і склаў гэты верш, таму што напачатку апісваецца тлумны горад, дзе толькі асфальт, трамваі і туга па радзіме...

«І раптам бачу: на рагу,
У прадаўшчыцы-маладзіцы,
Маю блакітную тугу —
Букет пралесак залаціцца.
І хоць на захадзе гарыць
Чырвоным сонца светафорам,
Я сэрцам зноў ля тых крыніц
І акрываўленых разораў,
Дзе на пакінутай зямлі,
На папялішчах, пералесках,
Як пад Масквою, расцвілі
Таксама першыя пралескі.
Ды сёння ў роднай старане
Каму яны азораць шчасце?
На безымянным кургане
Ім суджана вянком апасці.
Але за то, што расцвілі
Прадвеснікамі перамогі
На шматпакутнае зямлі,
На астравінах баравых,
Ля нашых спаленых парогаў —
Ад сэрца блаславіце іх,
Хто памятае, у край дарогу».

Пралескі ўвасабляюць не проста надыход вясны — яны сімвал непазбежнай перамогі, хуткага вызвалення роднай зямлі ад сцюжы акупацыі, сімвал неўміручай моцы народа, памяці пра загінулых.

«Кволыя пралесачкі... Нейкае трывогі не схаваць, не схаваць»

У абразку Максіма Гарэцкага «Вясна», напісаным у 1914 годзе, згадваюцца іншыя веснавыя кветкі — «жоўтыя красачкі», якія растуць ля балота. Што за яны? Можа быць, першацвет веснавы — адзін з відаў прымулы, можа быць, жоўтая фіялка ці крокусы? А мо гэта лотаць, якая якраз цвіце ў балоцістых мясцінах з красавіка?

«Гэй вы, шчасныя веснавыя дні!
Ганначка, сястрыца! Пойдзем у таўкачыкі, а на лагу там ля балота жоўтых красачак нарвём.
І дзеразы зялёненькай, лахматай надзяром, і яленцу наламаем, і шышачак набяром: азелянім, ахарошым сваю хатку старэнькую.
Макравата яшчэ ў полі, зямелька не высахла...
А ты лапцікі абуй.
Люблю цябе, прыгожая, за тое, што на грудзёх у цябе красачкі прышпілены. Ах, люблю я красачкі!
І аб чым ты, дзяўчынка мая, так задуманая? Чаго твае вочачкі чыстыя засмуціліся? Кволыя пралесачкі... Нейкае трывогі не схаваць, не схаваць».

Трывога, якую адчувае герой абразка, недарэмная... Праз некалькі месяцаў пачнецца Першая сусветная вайна. Максім Гарэцкі трапіць на фронт, будзе цяжка паранены, ледзь выжыве. Сумная доля чакае і яго сястру Ганну, прыгажуню і разумніцу. У 1922 годзе, у Маскве, яна павязе перадачу іх арыштаванаму брату і трапіць пад трамвай. Яе памяці Максім Гарэцкі прысвеціць складзеную ім хрэстаматыю беларускай літаратуры, Уладзімір Дубоўка — зборнік «Строма»: «Светлай памяці Ганулі Гарэцкай, як вяночак на магілку ў чужыне, — прысвячаю».

Сумныя жоўтыя красачкі ў тым вяночку...

«Праслічная, паўночная фіёлка»

Верш Алеся Гаруна, напісаны ў 1920 годзе, які таксама называецца «Пралескі», звярнуты да жанчыны, якая прыйшла адведаць хворага паэта. Гарун пасля доўгіх гадоў турмы і высылкі страціў здароўе, хварэў на сухоты. У вершы недарэмна згадваецца «Тайга шумячая на шчыце гор» — гэта з жыцця ў сібірскай высылцы. Працаваў на баржы, што плавала па Лене да Якуцка, здабываў золата ў Бадайбо: *«...не раз да болю ў пашчэнках, моцна сціскаючы зубы і мружучыся так, што аж балелі вочы, стараўся... заціснуць мазгі, каб яны, зрабіўшыся меншымі, не давалі прастору думкам».* Яшчэ больш сумна робіцца, калі ведаць, што ў тым жа 1920 годзе Алесь Гарун памрэ — паеў свежых вішань, купленых на базары, падхапіў дызентэрыю, арганізм аслаблены... А ў вершы шчымлівае спадзяванне.

«Прынеслі вы чароўныя дары вясны — пралескі,
У добрасці святой іх для мяне сваім зрабіўшы дарам,
Як колер гэтых кветачак, так домысл ваш — нябескі, —
Прыйсці, парадаваць вясной мяне ў маім замкненні шарым.
Зрабіўся мой пакой цяпер — пудэлак цесны мескі —
Тайгой шумячаю на шчыце гор, у паблізку к сонцу, к хмарам,
Ляжу ў ёй, хваін жывушчы пах п'ючы і горных зёлкаў,
А ў думках і ўваччу — праслічная, паўночная фіёлка».

«Тугі вясенняе пралескі»

Верш «Пралескі» Уладзімір Жылка напісаў у 1921 годзе. Гэта быў нялёгкі для паэта час. Нядаўні мінскі настаўнік захварэў на сухоты і пераехаў да дзеда на Наваградчыну, на свежае паветра... А ў сакавіку быў падпісаны Рыжскі дагавор, Жылка апынуўся ў Заходняй Беларусі, пад уладай панскай Польшчы. Наперадзе гады змагання... Але пакуль што паэт верыць у найлепшае.

«І хоць зімы відаць сляды,
Яшчэ марозіць часам ночкай,
Ды больш не страшаць халады
І верыш мілым сінім вочкам.
І любы так бясконца мне
Яны, з усмешкай ціхай дзеці...
Пара іх, кволых, праміне,
Прайдуць яны, як усё на свеце.
Але ўжо мкне душа мая
У сіню даль, за пералескі,
І ў сэрцы ўсходзяць — чую я —
Тугі вясенняе пралескі».

Заляцанні, кветкі, аплявухі

У сатырычнай аповесці Андрэя Мрыя «Запіскі Самсона Самасуя» з першацветаў згадваецца кветка-сон. Менавіта гэтыя чароўныя, сённяшнія вельмі рэдкія краскі растуць там, дзе малады кар'ерыст Самасуй вырашыў правесці маёўку для жыхароў вёскі Шапялёўка, куды ён дасланы «падымаць культуру». А заадно самаўпэўнены дурнавaты Самсон можа «падбіць кліны» да супрацоўніцы-прыгажуні Крэйны. Праўда, суседства прыгожых кветак не надта дапамагае Самасую ў куртуазных справах:

«Мы селі на курган недалёка ад усіх. Я моўчкі любаваўся Крэйнай. Ёсць абліччы прыгожыя, як гэтыя сінія кветкі-сон. На іх хочацца глядзець і пакутваць непераможнымі жаданнямі.

Гледзячы на Крэйну, я смяяўся шчаслівым жарабячым смехам. Яна здзіўлена пашырыла свае вочы і чакала, што з гэтага далей будзе. Тады я набраў моцы і сказаў:

— Крэйна! Крэйначка! Будзем з табой на ты? Добра?.. Далей слухай, што я скажу. Закахаўся ў цябе я — праўду кажу. Ты павінна звярнуць на маё захапленне максімум увагі. У маім каляндарным плане на сённяшні дзень вызначана два бязвінных пацалункі ад цябе. Гэтага я павінен дамагацца ад цябе, чаго б мне гэта ні каштавала!

І сказаўшы гэта, не доўга думаючы, я прыцмактаўся да чырвоных Крэйніных губ і запальна піў агністую кроў дзявоцтва!

Прыйшоўшы ў сябе ад неспадзяванасці, Крэйна адштурхнула мяне і так моцна, што ледзьве не загурчэў далоў з кургана. Тон у тон мне Крэйна сказала:

— Не цалуй мяне, ты прыцягваеш увагу шырокіх мас!»

Забайкальскія пралескі

У апавяданні «Міхасёвы пралескі» Ядвігі Бяганскай дзеянне адбываецца падчас Вялікай Айчыннай вайны ў Забайкаллі. Міхась з мамай прыехалі сюды з Беларусі, «ратуючыся ад вайны, ад фашысцкай няволі».

Але вось бяда — маці цяжка захварэла і трапіла ў бальніцу.

«А тым часам надыходзіла вясна, набліжаўся сакавік. Міхась успомніў, як штогод восьмага сакавіка ён з таткам прыносіў маці кветкі. Як радавалася яна гэтым першым вясновым краскам! Асабліва яна любіла пралескі. Таткі цяпер няма, і кветкі павінен прынесці ён, сын».

Але ж вясна ў Забайкаллі наступае пазней, чым у Беларусі, і кветкі пазней паказваюцца. Міхась звярнуўся да дзеда Ягора, у хаце якога жылі. І дзед Ягор надумаў пайсці з хлопчыкам па пралескі на цёплую крыніцу.

«Міхась ніколі яшчэ не бачыў, каб сярод снягоў біла з-пад зямлі такая цёплая вада. Над крыніцай узнімалася пара, а па беражках зелянела трава, жывая, вясёлая. Дзед Ягор назразаў ладных кавалкаў дзёрну, у якіх праглядвалі расліннкі ў срэбным пушку.

— Гэта і ёсць забайкальскія пралескі, — казаў дзед. — Прынясём іх у хату, у цяпло, пачнём паліваць вадзіцай, і яны пойдуць расці і зацвітуць».

Так што ў хуткім часе Міхась зайшоў у палату да маці, несучы перад сабой букет сініх пралесак. Маці была дужа шчаслівая.

Забайкальскія пралескі завуцца там вяргулькамі, ці ўргулькамі, і фактычна гэта тыя самыя беларускія кветкі-сон, альбо пралеснікі. Сібірскія рэаліі Ядвізе Бяганскай былі добра знаёмыя. Яна нарадзілася ў сям'і беларускіх перасяленцаў у Сібіры, вярнулася на Беларусь у 1922 годзе, стала жонкай беларускага паэта, потым ператварылася ў жонку ворага народа і ў гэтай якасці зноў апынулася ў Сібіры... І зноў вярнулася на Беларусь, была рэабілітаваная, працавала на радыё і напісала шмат цікавых кніжак для дзяцей.

Каханне на фоне кураслепаў

Улюбёная веснавая кветка Уладзіміра Караткевіча, мяркуючы па ўсім, — кураслеп. Упадабаў пісьменнік яе вобраз і дзякуючы знакавай у яго жыцці падзеі. У маі 1959 года ён разам з іншымі слухачамі Вышэйшых літаратурных курсаў у Маскве пабываў на экскурсіі ва Уладзіміры і Суздалі, з наведваннем царквы Пакрава́ на Нерлі. Праводзіла экскурсію іх выкладчыца Ніна Молева. Яна змагла захапіць студэнтаў хараством убачанага, чытала на фоне старажытнага храма літаратурныя творы... Карацей, і да гэтага Караткевіч быў закаханы ў сваю выкладчыцу, а тут яна для яго паўстала проста нейкім ідэалам — чытайце пра гэта ў рамане «Нельга забыць». А адразу па вяртанні з экскурсіі Караткевіч выказаў ураджанні ў імпрэсіі «Подыхі продкаў», якая пры яго жыцці не друкавалася:

«Трава зялёная, як у «Паўночнай ідыліі», кураслеп рассыпаў па ёй сваё тлустае золата, і маленькія браткі падмірґваюць нам сінімі вачыма. Але не гэта галоўнае. Там, на краі лугоў, зліўшыся з гэтым, молада-зялёным і залатым, уросшы ў гэты просты пейзаж, бачны стройны-стройны белы прамакутнічак са сціплым зялёным купалком...

Мы мімаволі паскорылі крокі. Яна плыве да нас, адрываючыся ад зямлі, як кветка, раскрытая небу, як неапалімая купіна, палаючая белым агнём...

Гэта было падобна на лікуючае замілаванне другам, гэта была проста радасць, што мы жывём на зямлі, што мы поруч. І гэтаму зусім не патрэбна было канчацца іншым... і горшым. Проста расла ў грудзях хваля ўдзячнасці: у мяне да маёй лепшай на свеце спадарожніцы, а ў яе — да мяне».

Неаднойчы Караткевіч узнаўляў той пейзаж і ў вершах: *«Успамін. Успамін. Дні пяшчотнай вясны ўспамінаю, На бязмежных лугах кураслепаў халодны пажар...», «Кураслеп на лугах Багалюбава, Белы храм над Нерлю-ракой».*

Абуджаецца зямля, з веснавой надзеяй пазірае на нас сінімі, блакітнымі, жоўтымі, белымі вачыма першацветаў... Давайце не падманваць яе давер, не рваць пяшчотныя кветкі — а любавацца імі, як любаваліся беларускія паэты і пісьменнікі.

Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.
Фота Андрэя ФЕАКЦІСТАВА.

Центр Промышленной Оценки

• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

Организатор электронных торгов	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1607
Продавец	ИМНС РБ по Слонимскому району, 231800, Гродненская область, г. Слоним, улица Пушкина, 34
Оператор ЭТП	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. Адрес ЭТП: www.ipmtorgi.by

Предмет электронных торгов –

ЛЕГКОВОЙ СЕДАН (SEDAN) VOLKSWAGEN PASSAT,

№ кузова WVWZZZ3CZ8P003674, р/знак 3836 КР-4, 2007 г. в., инв. № 01510009, по адресу: Гродненская обл., г. Слоним, ул. Пушкина, 34.

Начальная цена без НДС – 3 676,08 бел. руб. Шаг торгов – 183,80 бел. руб.

Дата и время начала и окончания электронных торгов:
с 11.00 до 11.10 17.04.2024 г.
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Дата и время окончания приема заявок:
заявки на участие в электронных торгах принимаются по **16.04.2024 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

Извещение о проведении электронных торгов опубликовано на сайте Государственного комитета по имуществу (http://gki.gov.by) от 02.04.2024 г.

Контактные телефоны: +375 (17) 310-36-37; +375 (29) 154-34-35.
E-mail: auction@cpo.by

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПУБЛИЧНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА С ПОНИЖЕНИЕМ НАЧАЛЬНОЙ ЦЕНЫ НА 25 %

УНП 490071264

Организатор аукциона: **ОАО «Гомельоблреклама»**
филиал «Эксперт-Услуга», г. Гомель, ул. Гагарина, 20, каб. 2.9.
Продавец: **открытое акционерное общество «Гомельторгмаш»,** г. Гомель, ул. Владимирова, 14 – в лице управляющего Насонова В.В.

Торги состоятся 18 апреля 2024 года в 11.00
по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, каб. 2.9.

Подробный перечень имущества в количестве 5 лотов, порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участников торгов, порядок проведения аукциона и условия размещены на официальном сайте Организатора торгов – **www.expert-usluga.by** или **www.gomeloblreklama.by,** раздел «Аукционы».
Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 26.10.2023 г.
Срок приема заявлений на участие в торгах и оплаты задатка – **с 03.04.2024 по 16.04.2024 г. с 9.00 до 16.00.**

Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактным тел.: **8 (0232) 50-67-86, Юлия Дмитриевна; 8 (0232) 50-63-96, Людмила Петровна.**
Контактные данные организатора аукциона: **8 (0232) 23-23-54, 8 (044) 599-18-16.**

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»

(Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки) извещает о проведении электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего **ОАО «Газпром трансгаз Беларусь»** (Продавец) на праве собственности.

Электронные торги состоятся 06.05.2024 в 11.00.

Лот № 1 в составе:
Комплекс недвижимого и движимого имущества дома приезжих «Марьяліво», в том числе:
1. Объекты недвижимого имущества:
1.1. - Дом приезжих с инв. № 600/С-123927, 504,5 кв. м;
- Кабельные линии связи д.п. Марьяліво с инв. № 100000037051;
1.2. Здание гаража с инв. № 600/С-113906, 46,2 кв.м;
1.3. Наружные сети водопровода «Дома приезжих «Марьяліво» с инв. № 600/С-113970, 46,0 м;
1.4. Наружные сети канализации «Дома приезжих «Марьяліво» с инв. № 600/С-113967, 47,3 м;
1.5. Наружные сети электроснабжения «Дома приезжих «Марьяліво» с инв. № 600/С-113928, 26,8 м;
1.6. Котельная с инв. № 600/С-64619, 31,3 кв. м.
2. Объекты движимого имущества:
2.1. кондиционер «СПЛИТ» Mitsubishi, инв. № 100000036148;
2.2. котельное оборудование, инв. № 100000037059;
2.3. автоматическая система полива, инв. № 100000037061;
2.4. настенный кондиционер General, инв. № 100000037064;
2.5. настенный кондиционер General, инв. № 100000037065;
2.6. настенный кондиционер General, инв. № 100000037066;
2.7. напольный кондиционер General, инв. № 100000037067;
2.8. автоматическая система полива, инв. № 100000037068;
2.9. кухня «Василинка», инв. № 100000037134;
2.10. люстра, инв. № 100000037139;
2.11. комплект мебели для гардероба, инв. № 100000037142;
2.12. комплект нестандартной мебели, инв. № 100000037150;
2.13. вентиляционная установка, инв. 100000037138;
2.14. зеркало, инв. № 100000037135;
2.15. зеркало, инв. № 100000037136;
2.16. зеркало, инв. № 100000037137.
3. Товарно-материальные ценности:
3.1. жалюзи вертикальные 105*180, № 500000111083;
3.2. жалюзи вертикальные 175*195, № 500000111082;
3.3. жалюзи вертикальные 200*180, № 500000111084;
3.4. жалюзи вертикальные 256*195, № 500000111076;
3.5. жалюзи вертикальные 275*195, № 500000111078;
3.6. жалюзи вертикальные 290*180, № 500000111079;
3.7. жалюзи вертикальные 290*195, № 500000111081;
3.8. жалюзи вертикальные 324*195, № 500000111080;
3.9. жалюзи вертикальные Сандра, № 500000111077;
3.10. карниз для штор 22м, № 500000111014;
3.11. принадлежности каминные, № 500000110756;
3.12. камень для каменки жадеит колотый 10 кг, № 500000219048;
3.13. камень для каменки жадеит колотый набор 50 кг, № 500000219047;
3.14. камин электрический, № 500000033864;
3.15. панель варочная Bosch PUE611BB1E, № 500000410954;
3.16. панель мебельная, № 500000034884;
3.17. панель мебельная, № 500000034885;
3.18. тумба, № 500000034886;
3.19. шкаф, № 500000034888;
3.20. шкаф, № 500000034890;
3.21. шкаф духовой Bosch HBF134EB0R, № 500000414391;
3.22. зеркало, № 500000111087.

Адрес: Минская обл., Минский р-н, Острошицко-Городокский с/с, д. Марьяліво; д. Марьяліво, пер. Высотный, 5; д. Марьяліво, пер. Высотный, 3.

Земельный участок 623685204101000526 площадью 0,2424 га. Целевое назначение земельного участка: земельный участок для обслуживания дома приезжих. Право постоянного пользования.
Начальная цена с НДС 20 % – 1 339 927,20 руб.
Задаток – 133 993,00 руб. **Шаг электронных торгов** – 5 %.
Срок для подписания договора купли-продажи: 20 (двадцать) рабочих дней со дня проведения электронных торгов (после предъявления Продавцу платежного документа, подтверждающего оплату вознаграждения Организатора электронных торгов).
Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП).
Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.
Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: 30.04.2024 в 16.00.

Организатор электронных торгов: ☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by
Электронный адрес ЭТП: gostorg.by

УНП 190055182

Годовой отчет эмитента ценных бумаг

ОАО «РАПС»

223014, Минский р-н, аг. Крупица, ул. Садовая, 20

ОДО «Фораудит» BY80 AKBB 3012 0808 4001 2420 0000, ОАО АСБ Беларусбанк, БИК AKBBBY2X, УНН 590328318

Бухгалтерский баланс на 31декабря 2023 г.

(тыс. руб.)

№ п/п	Наименование показателя	Код строки	На начало года	На конец года
	АКТИВ			
1	Долгосрочные активы	190	47673	52094
2	Краткосрочные активы	290	21710	24578
	БАЛАНС	300	69383	76672
	ПАССИВ			
3	Собственный капитал	490	51550	57056
4	Долгосрочные обязательства	590	9794	8943
5	Краткосрочные обязательства	690	8039	10673
6	БАЛАНС	700	69383	76672

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за 2023 г.

(тыс. руб.)

№ п/п	Наименование показателя	Код строки	За отчетный год	За прошлый год
1	Выручка от реализации продукции без налогов	010	33748	36504
2	Себестоимость реализованной продукции, работ и услуг	020	27964	30261
3	Управленческие расходы	040	1470	1334
4	Расходы на реализацию	050	200	136
5	Прибыль (убыток) от реализации	060	4114	4773
6	Прочие доходы по текущей деятельности	070	3736	7024
7	Прочие расходы по текущей деятельности	080	4458	7202
8	Прибыль (убыток) от текущей деятельности	090	3392	4595
9	Прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности	140	-512	-284
10	Прибыль (убыток) до налогообложения	150	2880	4311
11	Налоги и сборы из прибыли с учетом отложенных налоговых активов и обязательств	160-200	349	865
12	Прибыль (убыток) к распределению	210	2531	3446

Финансовые показатели подтверждены аудиторской проверкой (положительное аудиторское заключение).
Дивиденды на привилегированные и простые (обыкновенные) акции за 2023 г. выплачиваются с 1 апреля 2024 г. по 1 июля 2024 г.

Порядок выплаты дивидендов:
- работающим и неработающим акционерам – по ведомостям в кассе Общества или на карстчета;
- по заявлениям акционеров – почтовым переводом.

Директор Котов Н.Л.

Гл. бухгалтер Потапенко Н.П.

АУДИТОРСКОЕ ЗАКЛЮЧЕНИЕ ПО БУХГАЛТЕРСКОЙ ОТЧЕТНОСТИ

Открытое акционерное общество «Рапс»

г. Минск
Директору открытое акционерное общество «Рапс»
Котову Николаю Леонидовичу

АУДИТОРСКОЕ МНЕНИЕ
Мы провели аудит прилагаемой бухгалтерской отчетности ОАО «Рапс», (открытое акционерное общество «Рапс», Республика Беларусь, 223014, Минская обл., Минский р-н, аг. Крупица, ул. Садовая, 20. Свидетельство о регистрации. Зарегистрировано решением Минского облисполкома от 21.12.2010 года. УНП 600068480. Внесено в Единый государственный регистр юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 600068480), состоящей из бухгалтерского баланса на 31 декабря 2023 г. за период с 01.01.2023 по 31.12.2023 года, отчета о прибылях и убытках, отчета об изменении собственного капитала, отчета о движении денежных средств за год, закончившийся на указанную дату, а также примечаний к бухгалтерской отчетности, предусмотренных законодательством Республики Беларусь.
По нашему мнению, прилагаемая бухгалтерская отчетность ОАО «Рапс», сформированная в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности, достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение ОАО «Рапс» на 31 декабря 2023 г., финансовые результаты ее деятельности и изменение ее финансового положения, в том числе движение денежных средств за год, закончившийся на указанную дату, в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

ОСНОВАНИЕ ДЛЯ ВЫРАЖЕНИЯ АУДИТОРСКОГО МНЕНИЯ
Мы провели аудит в соответствии с требованиями Закона Республики Беларусь «Об аудиторской деятельности» и национальных правил аудиторской деятельности. Наши обязанности в соответствии с этими требованиями далее описаны в разделе «Обязанности аудиторской организации по проведению аудита бухгалтерской отчетности» нашего аудиторского заключения. Мы независимы по отношению к ОАО «Рапс» в соответствии с требованиями Закона Республики Беларусь «Об аудиторской деятельности», национальных правил аудиторской деятельности и Кодекса этики профессиональных бухгалтеров, принятого Международной федерацией бухгалтеров, и нами соблюдались прочие принципы профессиональной этики в соответствии с данными требованиями. Мы полагаем, что полученные нами аудиторские доказательства являются достаточными и надлежащими, чтобы служить основанием для выражения аудиторского мнения.

ПРОЧИЕ ВОПРОСЫ
Сравнительная информация в бухгалтерской отчётности подготовлена на основании данных бухгалтерской отчётности ОАО «Рапс» за 2022 год, которая была проверена ООО «МАиС Консалт Белстрой», аудиторское заключение которой датировано 17 марта 2023 года, аудиторское мнение без оговорки.

ОБЯЗАННОСТИ РУКОВОДСТВА АУДИРУЕМОГО ЛИЦА ПО ПОДГОТОВКЕ БУХГАЛТЕРСКОЙ ОТЧЕТНОСТИ
Руководство ОАО «Рапс» несет ответственность за подготовку и достоверное представление бухгалтерской отчетности в соответствии с законодательством Республики Беларусь и организацию системы внутреннего контроля ОАО «Рапс», необходимой для подготовки бухгалтерской отчетности, не содержащей существенных искажений, допущенных вследствие ошибок и (или) недобросовестных действий.
При подготовке бухгалтерской отчетности руководство ОАО «Рапс» несет ответственность за оценку способности ОАО «Рапс» продолжать свою деятельность непрерывно и уместности применения принципа непрерывности деятельности, а также за надлежащее раскрытие в бухгалтерской отчетности в соответствующих случаях сведений, относящихся к непрерывности деятельности, за исключением случаев, когда руководство намеревается ликвидировать ОАО «Рапс», прекратить его деятельность или когда у него отсутствует какая-либо иная реальная альтернатива, кроме ликвидации или прекращения деятельности.

ОБЯЗАННОСТИ АУДИТОРСКОЙ ОРГАНИЗАЦИИ ПО ПРОВЕДЕНИЮ АУДИТА БУХГАЛТЕРСКОЙ ОТЧЁТНОСТИ
Наша цель состоит в получении разумной уверенности в том, что бухгалтерская отчетность ОАО «Рапс» не содержит существенных искажений вследствие ошибок и (или) недобросовестных действий, и в составлении аудиторского заключения, включающего выраженное в установленной форме аудиторское мнение. Разумная уверенность представляет собой высокую степень уверенности, но не является гарантией того, что аудит, проведенный в соответствии с национальными правилами аудиторской деятельности, позволяет выявить все имеющиеся существенные искажения. Искажения могут возникать в результате ошибок и (или) недобросовестных действий и считаются существенными, если можно обоснованно предположить, что в отдельности или в совокупности они могут повлиять на экономические решения пользователей бухгалтерской отчетности, принимаемые на ее основе.

В рамках аудита, проводимого в соответствии с национальными правилами аудиторской деятельности, аудиторская организация применяет профессиональное суждение и сохраняет профессиональный скептицизм на протяжении всего аудита. Кроме того, мы выполняем следующее:
- выявляем и оцениваем риски существенного искажения бухгалтерской отчетности вследствие ошибок и (или) недобросовестных действий; разрабатываем и выполняем аудиторские процедуры в соответствии с оцененными рисками; получаем аудиторские доказательства, являющиеся достаточными и надлежащими, чтобы служить основанием для выражения аудиторского мнения. Риск необнаружения существенных искажений бухгалтерской отчетности в результате недобросовестных действий выше риска необнаружения искажений в результате ошибок, так как недобросовестные действия, как правило, подразумевают наличие специально разработанных мер, направленных на их сокрытие;
- получаем понимание системы внутреннего контроля ОАО «Рапс», имеющей значение для аудита, с целью планирования аудиторских процедур, соответствующих обстоятельствам аудита, но не с целью выражения аудиторского мнения относительно эффективности функционирования этой системы;
- оцениваем надлежащий характер применяемой ОАО «Рапс» учетной политики, а также обоснованности учетных оценок и соответствующего раскрытия информации в бухгалтерской отчетности;
- оцениваем правильность применения руководством ОАО «Рапс» допущения о непрерывности деятельности, и на основании полученных аудиторских доказательств делаем вывод о том, имеется ли существенная неопределенность в связи с событиями или условиями, в результате которых могут возникнуть значительные сомнения в способности ОАО «Рапс» продолжать свою деятельность непрерывно. Если мы приходим к выводу о наличии такой существенной неопределенности, мы должны привлечь внимание в аудиторском заключении к соответствующему раскрытию данной информации в бухгалтерской отчетности. В случае если такое раскрытие информации отсутствует или является ненадлежащим, нам следует модифицировать аудиторское мнение. Наши выводы основываются на аудиторских доказательствах, полученных до даты подписания аудиторского заключения, однако будущие события или условия могут привести к тому, что ОАО «Рапс» утратит способность продолжать свою деятельность непрерывно;
- оцениваем общее представление бухгалтерской отчетности, ее структуру и содержание, включая раскрытие информации, а также того, обеспечивает ли бухгалтерская отчетность достоверное представление о лежащих в ее основе операциях и событиях.
Мы осуществляем информационное взаимодействие с лицами, наделенными руководящими полномочиями, доводя до их сведения, помимо прочего, информацию о запланированных объеме и сроках аудита, а также о значимых вопросах, возникших в ходе аудита, в том числе о значительных недостатках системы внутреннего контроля.
Мы предоставляем лицам, наделенным руководящими полномочиями, заявление о том, что нами были выполнены все требования в отношении соблюдения принципа независимости и до сведения этих лиц была доведена информация обо всех взаимоотношениях и прочих вопросах, которые можно обоснованно считать угрозами нарушения принципа независимости, и, если необходимо, обо всех предпринятых мерах предосторожности.

Руководитель задания, Директор ОДО «Фораудит» С.А. Вильчиков (квалификационный аттестат Министерства финансов Республики Беларусь № 0000172)

м.п.

АУДИТОРСКОЕ ПРЕДПРИЯТИЕ
Общество с дополнительной ответственностью «ФОРАУДИТ».
231042, Республика Беларусь, г. Сморгонь, ул. Советская, д. 29-2.
Зарегистрировано решением Сморгонского районного исполнительного комитета за № 852 от 24 октября 2000 года.
Регистрационный номер в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей № 590328318.
Регистрационный номер записи в реестре аудиторских организаций – № 10005.

06 марта 2024

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

Карысна ведаць

Топ-6 прадуктаў для сэрца

Немалую ролю ў здароўі ў рабоце сардэчна-сасудзістай сістэмы адыгрывае няправільнае харчаванне, якое стала ўжо неад'емнай часткай жыцця сяродняестатыстычнага чалавека. Па словах спецыялістаў, людзі ўсё менш і менш задумваюцца аб тым, што яны ядуць і які ўплыў ежа аказвае на іх арганізм у цэлым, і на сэрца ў прыватнасці.

Менавіта таму медыкі і дыетолагі склалі спіс прадуктаў, найбольш карысных для сардэчна-сасудзістай сістэмы. Пра іх расказала **ўрач-педыятр 3-й гарадской дзіцячай клінічнай паліклінікі Валянціна РАХОЦКАЯ.**

У першую чаргу ў рацыён трэба ўключыць свежую садавіну, агародніну і з'ядаць іх не менш чым 400 грамаў за суткі.

Агародніна

Варта купляць моркву, агуркі, памідоры і іншую агародніну. А вось бульбу лепш есці як мага радзей, паколькі ў ёй шмат крухмалу, але мала клятчаткі.

Садавіна

Пажадана выключыць вінаград. Ён змяшчае вялікую колькасць глюкозы. Таксама варта не злоўжываць бананамі. З аднаго боку, у іх шмат вугляводаў, якія хутка павялічваюць узровень той жа глюкозы ў крыві, аднак з іншага — яны ўтрымліваюць шмат калію, які рэгулюе водна-салевы баланс і адказвае за сардэчны рытм. Усё астатняе вітаецца.

Марская рыба

Для сэрца і сасудаў вельмі карысная марская рыба, асабліва з паўночных мораў. Яе варта ўжываць як мінімум два-тры разы на тыдзень. У ідэале — пяць-шэсць разоў.

Арэхі

У спіс карысных прадуктаў для сэрца таксама ўваходзяць арэхі: грэцкія, кеш'ю, арахіс, кедравыя.

Аліўкавы алей

Аліўкавы алей змяшчае ў сабе вельмі важныя для арганізма Амега-3 і Амега-6 тлустыя кіслоты. Яны актыўна ўдзельнічаюць у рэгуляцыі абмену халестэрыну.

Горкі шакалад

Маецца на ўвазе шакалад з больш як 70-працэнтным утрыманнем какавы. Ён станоўча ўплывае на работу сардэчна-сасудзістай і нервовай сістэм. Бяспечна для фігуры можна ўжываць 20-30 грамаў горкага шакаладу ў дзень.

Скажыце, доктар...

АД ФАРЫНГІТУ ДА ЗАПАЛЕННЯ АБАЛОНКІ СЭРЦА

Чым небяспечны стрэптакок?

У кожнага інфекцыйнага захворвання ёсць узбуджальнікі — патагенныя або ўмоўна-патагенныя мікраарганізмы. Першыя трапляюць у арганізм звонку, другія належаць да натуральнай мікрафлоры і актывізуюцца толькі пры спрыяльных для размнажэння ўмовах.

З мільярда бактэрый, якія існуюць у свеце, стрэптакокі вельмі папулярныя. Яны ўспрымаюць чалавека як сваё навакольнае асяроддзе і рэзервуар для жыцця. Стрэптакокі часта называюць адной з самых небяспечных бактэрый. Яны могуць выклікаць шэраг захворванняў: фарынгіт, пнеўманію, шкарлятыну, інфекцыі скуры, эндакардыт (запаленне ўнутранай абалонкі сэрца) і іншыя. Але асноўная іх небяспека менавіта ў здольнасці выклікаць другасныя формы стрэптакокавай інфекцыі ў выглядзе токсіка-септычных захворванняў і запускаць аўтаімунныя рэакцыі, якія правакуюць складаныя захворванні: рэўматызм, цяжкае захворванне нырак, такое як гламеруланефрыт, васкуліты. Пра тое, як своечасова выязначыць і пазбавіцца ад небяспечных бактэрый, спыталі ў дзіцячага кардыярэўматолага вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі, урача ўльтрагукавой дыягностыкі 22-й гарадской дзіцячай паліклінікі Святланы ЛАПІЦКАЙ.

— Святлана Аляксандраўна, стрэптакок — адна з тых бактэрый, з якой чалавек жыве пастаянна?

— У працэсе эвалюцыі ў чалавека са стрэптакокам склалася даволі цеснае «сужыцельства», і таму інфекцыі дзенай групы шырока распаўсюджаныя як сярод дзяцей, так і сярод дарослых. У норме бактэрыі засяляюць слізістыя абалонкі і скуру чалавека, пастаянна прысутнічаюць у роце і ротавай поласці, насаглотцы, тоўстым кішэчніку, похве. Доўгі час стрэптакокавая інфекцыя можа прысутнічаць латэнтна, ніяк сябе не праяўляючы, — такі стан называецца бактэрыяносьбіцтва, і ён можа працягвацца да аднаго года.

— Якія захворванні найчасцей выклікае стрэптакок?

— Стрэптакокавая інфекцыя — гэта група інфекцыйных захворванняў, узбуджальнікамі якіх з'яўляюцца розныя віды стрэптакока. Гэтыя патагенныя мікраарганізмы пашкоджваюць у асноўным дыхальныя шляхі і скуру чалавека.

Аднак трэба сказаць, што не ўсе стрэптакокі небяспечныя. Стрэптакокавыя інфекцыі ўзнікаюць пераважна пад уздзеяннем β-гемалітычнага стрэптакока групы А. Ён сустракаецца паўсюдна, перадаецца пераважна паветрана-кропельным, а таксама кантактным (праз прадметы, цацкі, поціскі рукі) і харчовым шляхамі. Гэты мікраарганізм хутка размнажаецца ў малаць, тварагу, смятане, салодкіх крэмах.

Стрэптакокі ўстойлівыя да награвання, замарожвання, захоўваюцца некалькі тыдняў і нават месяцаў у засохлых біялагічных вадкасцях чалавека. Але затое яны лёгка гінуць пад дзеяннем сродкаў дэзынфекцыі. Так што апрацоўка рук дэзынфіцыруючымі сродкамі ніколі не будзе лішняй.

— Як гэтай інфекцыяй можна заразіцца?

— Крыніцай інфекцыі для навакольных з'яўляецца хворы чалавек.

Пік захворвання прыпадае на халодную пару года. Галоўным чынам, гэта першасныя формы стрэптакокавай інфекцыі, якія ўзнікаюць у месцы ўкаранення мікроба: паражэнне ЛОР-органаў, напрыклад глотачных мінданін (танзіліт), глоткі (фарынгіт) ці вуха (атыт), а таксама паражэнне скуры ў выглядзе стрэптадэрміі (імпетыга), рожы і шкарлятыны. Усе гэтыя захворванні добра паддаюцца лячэнню антыбіётыкамі.

Асноўная небяспека стрэптакока заключаецца ў яго здольнасці выклікаць другасныя формы стрэптакокавай інфекцыі ў выглядзе токсіка-септычных захворванняў, такіх як метатанзілярны і перытанзілярны абсцэсы, флегмоны, менінгіты, септычныя ўскладненні.

Але і яны яшчэ не самае горшае, што можа здарыцца пры працяглым кантакце са стрэптакокамі. Гэтыя мікраарганізмы ўяўляюць асабліву небяспеку для здароўя, бо вылучаюць таксіны, якія паражаюць органы чалавека і здольныя запускаць аўтаімунныя рэакцыі, што правакуюць цяжкія захворванні, — рэўматызм, гламеруланефрыт, васкуліты.

— Чаму і чым стрэптакок небяспечны для сэрца?

— Пры аўтаімунных працэсах імунітэт атакуе ўласныя клеткі сэрца і сасудаў з-за таго, што ў некаторых штамаў стрэптакока ёсць агульныя антыгенныя субстанцыі (своеасаблівыя пазнакі для распазнавання сваіх і чужых клетак) з тканкай сэрца і сасудаў. У выніку імунітэт чалавека памылкова пачынае знішчаць уласныя тканкі. Так узнікаюць аўтаімунныя захворванні, такія як вострая рэўматычная ліханка, гламеруланефрыт, васкуліты.

А калі ўлічыць, што слізістая абалонка верхніх дыхальных шляхоў і мінданін мае непасрэдную сувязь па лімфатычных шляхах з абалонкамі сэрца, то рызыка пашкоджання сэрца ў выглядзе вострай рэўматычнай ліханкі або хранічнай міякардыядыстрафіі даволі вялікая.

Ёсць і іншыя небяспекі. У выніку пападання стрэптакока ў арганізм пацыента пачынаецца актыўная выпрацоўка мноства небяспечных ферментаў. Яны правакуюць інтаксікацыю, выклікаюць парушэнне функцыянавання ўсіх структур. У першую чаргу ў вялікай колькасці сінтэзуецца стрэпталізін О. Гэтае рэчыва растварае клетачныя мембраны эрытрацытаў (чырвоных крывяных цельцаў), разбурае форменныя структуры і правакуе дэфіцыт кісларода ў тканках арганізма, што вельмі негатыўна адбіваецца на агульным стане здароўя. Супраць гэтага ферменту арганізм выпрацоўвае ахоўныя антыцелы (антыстрэпталізін О або скарочана — АСЛО) і па іх узроўні ў крыві можна меркаваць аб характары паталагічнага працэсу.

— Раскажыце падрабязней пра захворванні, небяспечныя для сэрца, — вострую рэўматычную ліханку і міякардыядыстрафію.

— Вострая рэўматычная ліханка — цяжкае захворванне з паражэннем не толькі сэрца, але і суставаў, якое прыводзіць да пароку сэрца і ў радзе выпадкаў — да інвалідызацыі. Аднак каб развілася гэта захворванне, патрэбна асаблівая індывідуальная гіперімунная (з залішнім запаленнем) рэакцыя арганізма на антыгены стрэптакока. І гэта вызначаецца спадчыннай схільнасцю. Таксама неабходны механізм працяглага ўтрымання стрэптакока групы А. А ён з'яўляецца толькі ў дзяцей 4—5 гадоў і старэй: пры паўторных сустрэчах са стрэптакокам на слізістых абалонках насаглоткі з'яўляюцца рэцэптары — спецыяльныя «пасадачныя пляцоўкі» для фіксацыі стрэптакока. Таму дзеці да 4—5-гадовага ўзросту не схільныя да захворвання на рэўматызм.

Хранічная стрэптакокавая інфекцыя — хранічны танзіліт, хранічны адэнаідыт, хранічны атыт, нават банальны карыес — зусім не бяскрыўдная для арганізма. Гэтыя захворванні таксама часта прыводзяць да пашкоджання сэрца — танзілагеннай міякардыядыстрафіі. Пры гэтым могуць з'яўляцца болі ў вобласці сэрца, парушэнні рытму і праводнасці на электракардыяграме (ЭКГ), змены на УГД сэрца.

Таму ўсе дзеці з хранічнай стрэптакокавай інфекцыяй павінны, акрамя назірання ў ЛОР-урача, мінімум раз на год рабіць ЭКГ, УГД сэрца і кансультавацца ў кардыярэўматолага. Пацыенты з высокімі паказчыкамі антыстрэпталізіну О павінны пракансультавацца ў кардыярэўматолага з прычыны неабходнасці медыкаментознай прафілактыкі вострай рэўматычнай ліханкі. А пасля вострых танзілітаў абавязковы запіс ЭКГ, у шэрагу выпадкаў — УГД сэрца з наступнай кансультацыяй кардыярэўматолага.

Смачна есці

ТРАЙНАЯ КАРЫСЦЬ

Якіх вітамінаў не хапае вясной?

Чым падкарміць свой арганізм пасля доўгай зімы? У якіх прадуктах шукаць патрэбныя вітаміны?

• Вітамін С: ***налягаем на квашаную капусту і замарожаныя ягады***

